*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

7 ЛІПЕНЯ 2009 г. АЎТОРАК
№ 123 (26481)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

## Малазабяспечаным грамадзянам будуць выдавацца крэдыты на тавары працяглага карыстання пад 10 працэнтаў гадавых

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 6 ліпеня падпісаў Указ № 371 «Аб ільготным спажывецкім крэдытаванні». Дакумент выдадзены ў мэтах узмацнення дзяржаўнай падтрымкі малазабяспечаных грамадзян Беларусі.**

Указам прадугледжана выдзяленне ў 2009—2010 гадах малазабяспечаным грамадзянам крэдытаў на спажывецкія патрэбы для набыцця нехарчовых груп тавараў працяглага выкарыстання. Права на атрыманне льготных спажывецкіх крэдытаў будуць мець грамадзяне, у якіх сярэднямесячны сукупны даход на кожнага члена сям'і, падлічаны за тры месяцы, якія папярэднічалі месяцу заключэння крэдытнага дагавора, не перавышае трохразовага сярэднямесячнага сярэднедушавога мінімальнага спажывецкага бюджэту сям'і з чатырох чалавек (цяпер 1130,8 тыс. рублёў). Функцыі па выдачы такіх крэдытаў ускладваюцца на ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк», «Белаграпрамбанк», «Белінвестбанк» і «Белпрамбудбанк». Крэдыты будуць выдавацца ў беларускіх рублях тэрмінам да трох гадоў з выплатай 10 % гадавых за карыстанне імі. Дзяржава за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту возьме на сябе нагрузку ў выглядзе кампенсацыі страт банкаў ад выдачы льготных крэдытаў. Прыняцце Указа дазволіць аказаць дадатковую дзяржаўную падтрымку малазабяспечаным слаям насельніцтва, што з'яўляецца яшчэ адным рэальным дзеяннем, накіраваным на ўмацаванне сацыяльнай абароненасці жыхароў нашай краіны.

## Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Казахстана з днём нараджэння

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Прэзідэнта Казахстана Нурсултана Назарбаева з днём нараджэння.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Выпрабаванне моцным даждом

**На гэтым тыдні чакаецца няўстойлівае надвор'е. Яго будзе вызначаць моцны паўднёвы цыклон, які рухаецца ўздоўж заходняй мяжы нашай краіны, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый РАБАЎ.**

Таму, пачынаючы з аўторка, у сераду ўдзень і ў чацвер уначы чакаюцца дажджы, месцамі дажджы моцныя і навальніцы, пры навальніцах узмацненне ветру да 15—20 м/сек. Тэмпература паветра ўначы 10—17, удзень 19—25, па паўднёвым усходзе да плюс 28.

У чацвер удзень надвор'е будзе паляпшацца. У пятніцу, суботу і нядзелю чакаецца цёплае і камфортнае надвор'е. Тэмпература паветра ўначы 8—15, удзень 20—26, па поўдні да 28 градусаў. Месцамі пройдзе невялікі кароткачасовы дождж.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Извещение
## О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

По поручению ОАО «Экран» КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит повторный открытый аукцион по продаже комплекса зданий, сооружений и оборудования, расположенных по адресу: г. Борисов, ул. Полка Нормандия-Неман, 167, в составе: 1) Насосная станция оборотного водоснабжения — сооружение 31, об.пл. 399 кв.м.; 2) Корпус 12 — гараж, об.пл. 2336 кв.м; 3) Хлораторная, об.пл. 62,2 кв.м; 4) Эстакада для мойки машин ж/б; 5) Устройство ограждения промплощадок (протяж. 402 м); 6) Автодороги внутриплощадочные; 7) Тепловые сети; 8) Сети водопровода; 9) Канализационные сети; 10) Ливневая канализация предприятия; 11) Внешнее электроснабжение; 12) Подстанция КТП-1388; 13) Конденсаторная установка (2 ед.); 14) Кран балка ЭП-2 (3 ед.). Начальная цена с НДС — 965 283 170 белорусских рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.05.2009 г. Аукцион состоится 14.07.2009 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 13.07.2009 г. до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
**о проведении аукциона**

По поручению ОАО «Купалинка» КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион по продаже здания холодильной станции, об. пл. 404,4 кв.м, расположенного по адресу: Солигорский район, Метявичское шоссе, 5 (участок № 2). Начальная цена с НДС — 193 215 560 бел. руб. Площадь земельного участка — 0,2384 га. Задаток в сумме 10 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 дней со дня подписания договора купли-продажи. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **11.08.2009 г.** в 15.00 по адресу: г. Солигорск, ул. К. Заслонова, 58, к. 510 (зал заседаний). Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.08.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324.

**Тел: (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.**

Самая старая беларуска:

# «КУДЫ Ж МНЕ ЗАМУЖ, ЯК УЗБЯРЭЦЦА МУЖЫК — ДЫК І ЗАДУШЫЦЬ!..»



**Ганна Рагель з Маладзечна святкуе 120-годдзе! Доўгажыхарка распавяла карэспандэнту «Звязды», як правільна займацца сэксам, захаваць сямейнае шчасце і ніколі не звяртацца да лекараў.**

Упершыню я прыехаў у Маладзечна да Ганны Паўлаўны Рагель два гады таму. У маім тэлефоне яе нумар так і занатаваны — «Hanna 118». Яшчэ тады я ашалеў ад маштабу яе жыцця. У пашпарце значыцца дата нараджэння — 1889 год. Цяжка ўявіць, але тады яшчэ не было на белым свеце ні Максіма Багдановіча, ні Барыса Пастарнака. Янку Купалу і Якубу Коласу было па сем гадоў. Ганне Ахматавай было два тыдні!..

Таму гэтым разам, у дні яе 120-годдзя, мы з Ганнай Паўлаўнай сустракаемся як старыя знаёмыя. Стаўлю на стол торцік, дачка доўгажыхаркі Любоў Аляксандраўна запарвае гарбатку.

**— Як пажываеце?** — пытаюся ў Ганны Рагель, якая старэйшая за мяне на 98 гадоў.

— Кепска... — уздыхае бабуля. — У нас хату ўкралі... Харошая хата гэна мая... Мы з мужыком маім рабілі, рабілі... А яны ўкралі — гэтыя зладзеі, ёсьць тут такія...

Я кладу бабулі кавалак торта, яна пачынае аб'ядаць свежы крэм зверху, а Любоў Аляксандраўна тым часам тлумачыць мне падрабязнасці.

— У вёсцы Дубіна-Баярская, што пад Валожынам, была хата, дзе я нарадзілася. Маці прыйшла туды замуж, і пасля вайны яны з мужам-кавалём збудавалі гэтую хату. У свой час, калі маці ўжо стала старэнькая і занемагла, я перавезла яе да сябе сюды, у Маладзечна. Даглядаць тую хату асабліва часу неставала — усё-ткі трыццаць кіламетраў адсюль. Людзі розныя бываюць — расцягалі адтуль вокны, дзверы, раскідалі печ... Але сам зруб быў у выдатным стане, мы меркавалі прадаць яго каму пад лецішча. І вось да нас прыходзіць такая навіна — сельсавет хату раскідаў, а месца тое засыпалі пясочкам — што і не пазнаць, дзе была тая хата...

> **«Я колькі жыву, дык ні разу ў дохтара не была. У мяне ад галавы ёсьць таблетачкі. Я вазьму, панюхаю іх добранька — і ўсё.»**

Ганна Паўлаўна вельмі моцна засмуцілася ад усёй гэтай гісторыі — і стала сябе значна горш пачуваць...

— Я жыла нічога... Але як укралі ў нас гэную хату, дык як за сьцяну я заступіла. Вось — бяз палак нідзе і не пайду. Нідзе — не-не!.. Толькі на ганак выйду, калі дажджу няма і ня сьлізка. Пахаджу трохі — і сяду. Вот якая жысьць цяпер мая. Але вось як вы прыехалі і пабылі — можа, дасьць Бог, мне і лепей будзе. Во!..




Фенаменальна, але ў 120 гадоў у Ганны Паўлаўны засталіся свае зубы, а чытае доўгажыхарка без акуляраў (хоць і па літарах)!.. Прапаную Ганне Паўлаўне яшчэ кавалачак торціку.

— Вой, я дык ела ўжо, дык можа ўжо і ня буду... Але зьем троху! Ужо ж вы дамоў не павезяцё!

Разам з сабой у Маладзечна я ўзяў сваю сяброўку Янку — паглядзець на ўнікальную 120-гадовую бабулю. Ганна Паўлаўна глядзіць на яе і пытаецца ў мяне:

— А гэта баба твая?

Паколькі бабуля дрэнна чуе — ды і ўвогуле, каб не напружваць яе тлумачэннямі, што гэта не «баба», а сяброўка, адказваю, што так.

— Як тваю бабу зваць? — ажыўляецца Ганна Паўлаўна.

— Янка.

— Ленка?

— Янка!

— Ленка?

— Янка!!

— Жэнька?

— Так!!!

— І жывіце харашо! — дабраслаўляе Ганна Паўлаўна. — Каб вы жылі так, як я са сваім жыла!.. Але нічога ж не зробіш: пара прыйшла — і пайшоў. А баба з тваёй вёскі ці так адкуль?..

Ну што ж, тэатр дык тэатр. Адказваю, што з маёй вёскі.

— І правільна! І жывіце харашо! Толькі ўсяго гарэлкі ня піце!..

**— А вы ніколі не пілі гарэлку?**

— Не-а! Не піла і ня п'ю. Віна магу капельку ўзяць — а то крэпкае. Тры каплі вазьму — і ўсё.

**— А есці што любіце?**

— А есьці — што ёсьць! У нас хватае есьці. Скварачак насмажылі... Сьвіньню закалолі, а яшчэ ж парсюк ё ў мяне ў хляве. Дык у нас мяса хватае — ёсьць, дзякуй Богу, у нас. І казёл, маладая козачка і старая каза ё. Нам малака хватае...

Пытаюся, чаго тады не хапае. Кажа, што здароўя. Пра грошы доўгажыхарка адказвае па-філасофску.

— Пэнсыі хватае.

Мова Ганны Паўлаўны — салодкі спеў для вуха многіх беларусаў. Яе не кранулі ніякія моўныя рэформы: гаворыць Ганна Рагель так, як казалі і пісалі беларусы стагоддзе таму, у пару яе маладосці — «пэнсыя», «Маладэчна», дадае мяккасць, якая ў многім знікла падчас рэформаў — «ёсьць», «сьціхнуць», «павезьлі»...

**— А памятаеце, колькі вам гадоў?** — вяртаю я суразмоўцу да святочнае нагоды.

— Любка, сколькі нам... мне гадоў? — паварочваецца Ганна Паўлаўна да дачкі. — Я ўжо нічога ня знаю. Ужо я забываюся ўсё. Любка, дзе мая кніжачка (Ганна Паўлаўна мае на ўвазе пашпарт. — **Аўт.**). Мне шмат гадоў... Ужо мае гады... І маладзейшыя ў землях ляжаць... А я — дзякуй Богу!

Ганна Паўлаўна зноў пераключаецца на цікавую ёй тэму.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

**Еш сваё!**

# ВОСЬ ТАКОЙ ШЫРЫНІ!

*У рэстаране «Ракаўскі бровар» выпеклі самы вялікі ў Беларусі дранік*

**На працягу дванаццаці гадзін каманда з ліку кухараў рэстарана «Ракаўскі бровар» працавала над выпечкай самага вялікага ў Беларусі драніка. Яго даўжыня склала 1,67 м.**

— Сам працэс смажання заняў прыблізна чатыры гадзіны, — расказвае кухар Аляксей, адзін са стваральнікаў бульбяного шэдэўра. — Для выпякання было выкарыстана 30 кг бульбы, больш за 60 яек, каля трох кілаграмаў цыбулі. Найбольш цяжкім у працэсе гатавання было перавярнуць дранік, бо ён вельмі вялікі. Каб яго спячы, заказвалі нават спецыяльную патэльню. Але галоўнае, — упэўнены Аляксей, — гатаваць з душой, тады ўсё атрымаецца.

Гіганцкі для звычайнай патэльні дранік быў выпечаны па ініцыятыве электроннага партала «Relax.by», які рэалізуе праект «Кніга рэкордаў». За год існавання інтэрнэт-партала было зафіксавана звыш 35 рэкордаў, сярод якіх «Самы вялікі антыкрызісны торт», «Самы вялікі махіта», «Самы вялікі выбар пяльменяў», «Самая вялікая калекцыя вінаў», «Самая вялікая кружка піва», «Самая вялікая талерка супу».

— Ідэя стварэння кнігі рэкордаў «Relax.by» узнікла год таму. На нашым сайце вельмі шмат інфармацыі пра рэстаранны бізнэс, маем каталогі ўсіх рэстаранаў, — распавядае **кіраўнік праекта «Relax.by» Марыя АЎДЗЕЕВА.** — І мы вырашылі здзівіць наведвальнікаў нечым незвычайным. У выніку больш чым 20 рэстаранаў узялі ўдзел у аб'яўленым тэндары на выпяканне драніка. «Ракаўскі бровар» — рэстаран, які адзін з першых адгукнуўся на аб'яву і прапанаваная імі велічыня драніка была самай вялікай з усіх заявак. Таму менавіта гэтаму рэстарану была даручана адказная місія.




Адметна тое, што самы вялікі ў Беларусі дранік быў выпечаны напярэдадні Купалля. «На Купалле адбываюцца цуды, вось мы і вырашылі прэзентаваць свайго беларускага асілка — амаль двухметровага росту! — пракаментаваў шэф-кухар рэстарана.

**Ілья ЛАПАТО. Фота аўтара.**

Минский городской центр недвижимости

**ОАО «Белтрансгаз» (продавец) совместно с УП «Минский городской центр недвижимости» (организатор аукциона)**

## ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

**по продаже водоотливной установки УВТ-500 на базе трактора ДТ-75 (инв. № 3511).**

Начальная цена — 23 915 000 белорусских рублей без учета НДС.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о государственной регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка в размере 1 195 750 белорусских рублей, иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона заключается в течение 5 рабочих дней с даты проведения аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 5 рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи. Аукцион состоится 07 августа 2009 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 06 августа 2009 года до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 227 48 36, (017) 227 40 22 — УП «Минский городской центр недвижимости»; (017) 503 76 73, 219 13 22 — ОАО «Белтрансгаз». Интернет: www.mgcn.by**

# ПЯЛЮШКІ АД МІНІСТРА

*Дабрачынная акцыя «Белая Русь — з любоўю да дзяцей» прайшла ўчора ва ўстановах аховы здароўя горада Мінска*



***Міністр аховы здароўя Беларусі Васіль ЖАРКО (злева) і міністр адукацыі Беларусі Аляксандр РАДЗЬКОЎ віншуюць Ніну САРАГАВЕЦ з прыбаўленнем.***

Падарункі мамам, дзеці якіх нарадзіліся ў святочныя дні, у тым ліку і 3 ліпеня, у другім гарадскім радзільным доме ўручалі міністр аховы здароўя Беларусі Васіль Жарко і міністр адукацыі, старшыня рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Аляксандр Радзькоў. Парадзіхі атрымалі розныя прылады для немаўлят. Дарэчы, у Дзень Незалежнасці ў гэтай установе з'явіліся на свет шасцёра малых. Сярод іх дзяўчаткі-двайняткі Маша і Паліна Сарагавец. Мама Ніна на дачушак не нарадуецца! Прыгажуні, кажа. Нарадзіліся дзяўчаткі крыху раней за тэрмін, таму падрастаюць пакуль у палаце інтэнсіўнай тэрапіі. Там за імі спецыяльны догляд. Усяго ж 2 і 3 ліпеня ў другім раддоме нарадзілася 21 немаўля. Большасць з іх — хлопчыкі.

Акцыя прайшла у 1-й, 3-й, 5-й, 6-й гарадскіх клінічных бальніцах, Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры «Маці і дзіця».

**Марыя ЖЫЛІНСКАЯ. Фота аўтара.**



***У святочныя дні нарадзіла дачушку Валерыю і Юля АНІКАНАВА.***

Баксёр Юрась РАМАНАЎ:

# «ДА ТЫТУЛА ЧЭМПІЁНА СВЕТУ ЗАСТАЎСЯ АДЗІН КРОК»



**Ужніўні баксёр Юрась Раманаў пазмагаецца за тытул чэмпіёна свету сярод прафесіяналаў у лёгкай вазе. Апякае беларуса прамоўтар Дон Кінг, які ў свой час займаўся сапраўднымі легендамі бокса Мухамедам Алі і Майкам Тайсанам.**

Але мала хто ведае, што яшчэ некалькі гадоў таму беларускі баец думаў завязваць са спортам і некалькі гадоў жыў з высокай тэмпературай. «Звязда» даведалася пра поўны драматызму лёс баксёра Юрася Раманава.

***(Заканчэнне на 3-й стар.)***

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## АБАМА Ў МАСКВЕ

**Прэзідэнт ЗША Барак Абама прыбыў учора з першым пасля ўступлення на пасаду візітам у Маскву. Яго суправаджаюць жонка Мішэль і дзве дачкі — Малія і Саша.**

У Крамлі прайшлі перамовы прэзідэнтаў Расіі і ЗША Дзмітрыя Мядзведзева і Барака Абамы. Па іх выніках павінен быць падпісаны пакет дакументаў, у тым ліку па СНУ, ядзерным супрацоўніцтве, па Афганістане і транзіце грузаў у гэтую краіну, а таксама па ваенным супрацоўніцтве.

## У КІТАІ ЗАГІНУЛІ 140 ЧАЛАВЕК

**У Кітаі адбыліся масавыя беспарадкі, у якіх загінула больш за 140 чалавек. Колькасць параненых набліжаецца да тысячы, некалькі сотняў арыштаваныя. Падставай для пагромаў стаў даўні этнічны канфлікт паміж кітайцамі і ўйгурамі.**

Ва Урумчы, сталіцы Сіньцзян-Уйгурскага аўтаномнага раёна, адбыліся маштабныя сутыкненні на этнічнай глебе. Усю ноч у найбуйнейшым горадзе на захадзе Кітая гарэлі машыны і аўтобусы, маніфестанты штурмавалі крамы, прыналежныя прадстаўнікам тытульнай кітайскай нацыянальнасці хань, прарывалі паліцэйскія загароды, закідваючы праваахоўнікаў каменнем і бутэлькамі. Ахвярамі пагромаў стала больш за 140 чалавек, яшчэ 816 чалавек параненыя.



Беспарадкі ва Урумчы сталі водгукам на нядаўняе забойства двух уйгурскіх рабочых на фабрыцы цацак у правінцыі Гуандун на поўдні Кітая. Іх лінчавалі за нібы здзейсненыя сэксуальныя дамаганні ў дачыненні да дзяўчыны нацыянальнасці хань. Адказнасць за пагромы афіцыйны Пекін усклаў на ўйгурскую дыяспару за мяжой.

## ЮШЧАНКУ ПАКАЗАЛІ РАСІЙСКІ ТРЫКАЛОР

**У Севастопалі падчас святкавання Дня флоту Украіны невядомыя паднялі ў паўночнай частцы горада пяціметровы расійскі сцяг, а ўздоўж мыса разгарнулі трыццаціметровы трыкалор.**

Сцягі былі разгорнуты падчас адплыцця ад Графскай прыстані адміральскага катэра з прэзідэнтам краіны Віктарам Ющанка на борце. З'яўляючыся галоўнакамандуючым Узброенымі сіламі Украіны, ён накіроўваўся для абыходу караблёў украінскага флоту і віншавання іх экіпажаў. Да прыбыцця міліцыі невядомым дэманстрантам удалося схавацца.

## ПАЛЯКІ ПЕРАДУМАЛІ МЯНЯЦЬ ЗЛОТЫ НА ЕЎРА

**У польскім грамадстве адбылася рэзкая змена стаўлення да агульнаеўрапейскай валюты — большасць палякаў ужо не хочуць адмаўляцца ад злотага на карысць еўра. Пра гэта сведчаць вынікі сацыялагічнага апытання.**

Так, за пераход на еўра цяпер выступаюць толькі 17 % рэспандэнтаў, супраць — 25 %, а яшчэ 33 % хочуць пачакаць і прыняць рашэнне ў будучыні. У пачатку гэтага года прыхільнікаў еўра ў Польшчы было значна больш. Як мага хутчэй адмовіцца ад злотага тады хацелі 26 % удзельнікаў апытання, а 39 % выказваліся за плаўны пераход на агульнаеўрапейскую валюту. Польскія ўлады раней заяўлялі аб магчымасці перайсці на еўра да 2012 года, як аб сваім прыярытэце. У цяперашні час ніякіх афіцыйных заяў па гэтай падставе не робіцца.

РАДИО МИНСК PM 92,4FM

Слухайце агляды матэрыялаў газеты «Звязда» на Радыё-Мінск з аўторка па пятніцу ў ранішняй праграме

**«КАВА ПА-ВЕНСКУ».**

(Мінск - 92.4 FM, Віцебск – 106.4 FM, Магілёў - 98.1 FM, Гомель – 105.6 FM)

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 7.07.2009 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША | 2 848,00 |
| ▼ 1 еўра | 3 966,12 |
| 1 латвійскі лат | 5 688,04 |
| 1 літоўскі літ | 1 147,74 |
| 1 чэшская крона | 152,75 |
| 1 польскі злоты | 905,71 |
| ▼ 1 расійскі рубель | 90,66 |
| 1 украінская грыўня | 373,26 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

**Цэнтрабанк РФ**

| | |
|---|---|
| USD | 31,4143 |
| 10 UAH | 41,1721 |
| 1000 BYR | 11,1044 |
| EUR | 43,8481 |

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

## Извещение
## О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

По поручению ОАО «БелОМО — ММЗ имени С.И. Вавилова» КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит повторный открытый аукцион по продаже складского комплекса, расположенного в Минском районе, промузел «Колодищи» в составе: **1)** Здание арочного складского помещения № 5, 679,5 кв.м; **2)** Здание арочного склада № 8, 697,5 кв.м; **3)** Здание арочного склада № 6, 373,3 кв.м; **4)** Здание склада, 652,8 кв.м; **5)** Здание котельной, 251,7 кв.м; **6)** Здание проходной, 36,6 кв.м; **7)** Здание сборно-щитового домика, 58,4 кв.м; **8)** Здание склада цемента и мела, 33,9 кв.м; **9)** Здание склада, 4316,5 кв.м; **10)** Здания блока металлических складов, 324,5 кв.м; 326,3 кв.м; **11)** Здание металлического склада, 68,2 кв.м; **12)** Здание склада древесного пека, 54,8 кв.м; **13)** Здание автовесов, 25,2 кв.м; **14)** Здание трансформаторной подстанции, 117,7 кв.м; **15)** Здание насосной станции, 57,5 кв.м; **16)** Здание блока складских помещений, 844,7 кв.м; **17)** Здания складов, 141,0 кв.м; 184,9 кв.м; 240,5 кв.м; 258,4 кв.м; **18)** Пристройка к сборно-щитовому домику, 70,5 кв.м; а также сооружений и оборудования. Начальная цена с НДС (снижена на 20 %) — 12 927 378 229 бел. руб. Площадь земельного участка — 7,9748 га. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.05.2009 г. Аукцион состоится **21.07.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.07.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34. Сайт в интернете: www.rlt.by.**

# ВАЙНА ВАЧЫМА ДЗІЦЯЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак у нумарах за 2 і 4 ліпеня.)*

## Вызваленне

Калі нехта сказаў, што бачылі нашых разведчыкаў і што немцаў на вышках няма, мы нават не ўзрадаваліся. Потым глядзім — хтосьці бяжыць, хтосьці паўзе па гразі. Потым пачаліся выбухі, крыкі і прагучала каманда нікому не рухацца — усё наўкола замініравана. Людзі пачалі паўзці назад. А ў нас нават не было моцы падняцца з зямлі. Пазней з'явіліся нашы салдаты, сталі камандаваць, што нам рабіць, людзі пачалі зноў варушыцца, а мы ўсё сядзелі. І раптам нас знайшоў дзядуля: яны недзе працавалі і іх кармілі адзін раз на дзень, вось дзядуля трохі і прыхаваў. Нас паднялі дзядуля і двое салдат і панеслі. Гэта было ўратаванне. Салдаты, не шкадуючы сябе, ратавалі нас, самі захворвалі, паміралі ад тыфу.

Дзякуючы медыцынскім працаўнікам, салдатам Чырвонай Арміі, нас вярнулі да жыцця. Пасля шпіталя нас размясцілі ў сям'ю, дзе было двое сваіх дзяцей і бабуля. Ім самім не было чаго есці, але яны дзяліліся апошняй шклянкай малака. Паколькі наша вёска яшчэ была пад немцамі, мы знаходзіліся там да канца чэрвеня. Недзе 8-10 ліпеня нас на грузавой вайсковай машыне прывезлі на чыгуначны вакзал у Магілёў. Мы там сядзелі некалькі дзён. Зрэдку прыязджала палявая кухня і раздавала хлеб і кашу. Бабуля ўсё бегала і шукала, хто б нас мог падвезці да вёскі. Раптам у Мішы, а яму ўжо споўнілася 5 гадоў, паднялася высокая тэмпература, дзяжурны па вакзале ў вайсковай форме некуды паведаміў — прыехалі і Мішу забралі, а ні маму, ні бабулю не ўзялі. Куды павезлі — невядома. Я ўсю ноч праплакала, мяне не маглі супакоіць, я ўсё галасіла: хто ж яго там будзе глядзець, хто падасць вады...

## Вяртанне

Раніцай бабуля прыняла рашэнне ісці ў вёску пехам, пакуль не захварэлі іншыя. Ішлі 4 ці 5 дзён, прасілі міласціну ў вёсках. Прыйшлі. Вёску было не пазнаць: усё спалена, зарасло бур'янам, нават дарога зарасла. Нідзе не відаць людзей. Я зноў плакала, што мы не прыйшлі дадому, і маме давялося мне паказваць магілкі нашы, каб я пераканалася.

На бабуліным дварышчы дзядуля змайстраваў з палак і недагарэлай саломы будан, з цэглы ў двары збудаваў печ. Гэта была вялікая радасць, што мы жывыя, што мы дома, што свеціць сонца. Але што рабіць далей? Запасаў ежы ніякай, ніякага адзення, пасцельных рэчаў. На пажарышчы знайшлі нейкі гарэлы посуд. Праз два дні захварэла на тыф старэйшая сястра Марыя. Яе забралі ў шпіталь за 8 кіламетраў. А пра Мішу нічога не было вядома...

Ад голаду нас выратавала тое, што дзядуля закапаў у хляве бочку з жытам: хаваў у свой час ад немцаў. Спачатку думаў, што яна згарэла разам з хлявом, а потым стаў капацца і знайшоў яе. Тады мама пайшла на наша дворышча — яна там закопвала куфар з адзеннем і бочку з ячменем. Яму нехта раскапаў, адзення там не было, а бочка была на сваім месцы. Праўда, ад дажджоў і снегу ячмень скіс, але не згніў. Дзядуля з нейкіх жалязяк змайстраваў жорны, дзе мы малолі збожжа і варылі зацірку. Солі не было, аднак і гэта ўжо была ежа. На лузе збіралі шчаўе, елі яго пучкамі. А ў лес яшчэ хадзіць баяліся.

## Хвароба

Саджаць у зямлю што-небудзь было ўжо позна. Дый не было насення, не было чым капаць зямлю. Дзядуля пайшоў у суседнія вёскі, каб зарабіць там на якое адзенне, пасцель ці інструмент. А бабуля пайшла пехам у Магілёў шукаць Мішу. І тут адначасова захварэлі на тыф мама, Надзя і Лёша. У мамы дык была асабліва высокая тэмпература — яна ляжала ў стане трызнення. Я зацягнула ўсіх у будан. Дзень і ноч паліла вогнішча, грэла ваду і паіла іх. Дзякуй Богу, што ў вёску вярнулася Варвара Лобасава, у якой была карова. Калі яна даведалася, што ўсе хварэюць, яна штодзённа прыносіла чвэртачку малака. Я разбаўляла яго вадой і паіла іх. Амаль два тыдні я была з тыфознымі хворымі. Не было лекаў. Я толькі рабіла халодны кампрэс на лоб і давала шмат гарачай вады, пазней — з малаком. Сама на тыф я так і не захварэла.

Праз 10-12 дзён прыйшла бабуля і прынесла Мішу. Яна абышла ўсе бальніцы і шпіталі Магілёва і ўсё-такі яго адшукала. Ён ачуняў і яго трымалі ў бальніцы, каб канчаткова ачуняў. Прыйшла з бальніцы Маня, вярнуўся дзядуля. Ён зарабіў, як сказаў, галоўнае — пілу, сякеру і іншы інструмент. Дзядуля вырашыў будаваць жытло.

## Хата

Калісьці да вайны за нашай сядзібай культываваўся хмель. Стаялі слупы, быў нацягнуты дрот. Немцы дрот паздымалі. А слупы падгнілі і пападалі. І дзядуля вырашыў з гэтых слупоў будаваць хатку. Ён, бабуля, я, Маня цягалі на вяроўцы гэтыя слупы, чысцілі незгарэлыя бярвенні хаты і хлява. Дзядуля пачаў рабіць зруб. А мы раскопвалі пагарэлыя печы, адбіралі цэлыя цагліны і цягалі іх. У лесе рвалі мох, капалі гліну, недзе знайшлі аконную раму.

Мама была яшчэ слабая. Мы яе шкадавалі і не дазвалялі цягаць цяжкія ношы. Бабуля з дзвюма іншымі жанчынамі паехала ў Заходнюю Беларусь жаць хлеб, каб да вясны зарабіць на сяўбу. Дзядуля вельмі абнядужаў ад цяжкай працы і недаядання. Яшчэ ён упаў спінай на бервяно, а другое ўпала яму на грудзі. Калі б нас не было побач, дзядуля памёр бы. Аднак ён пабудаваў хату. У кастрычніку мы з будана перасяляліся ў хату, і каб усім было дзе спаць, ён зрабіў палаці — там зімой было цёпла. Гэта была першая хата ў вёсцы. Усе астатнія, хто вярнуўся, жылі ў зямлянках.

Узімку да нас збіралася цэлая хата жанчын з дзецьмі, на загнеце гарэлі смалякі, а ўсе сядзелі на палозе і гутарылі пра тое, што перажылі. Яшчэ лісты не даходзілі да вёскі, ішла вайна і, відаць, яшчэ ніхто не ведаў, што вёску вызвалілі.

## Галодная вясна

З надыходам вясны прыйшоў голад — усё збожжа было з'едзена. Вельмі стаў слабы дзядуля: цяжкая праца, зламаныя рукі і ўдар па галаве ад Ганса, удар па грудзях бервяном, вясенні голад — усё гэта адбілася на яго здароўі. А яшчэ ён вельмі хацеў солі, хоць бы каліва. А дзе яе было ўзяць? У красавіку, так і не дачакаўшыся Перамогі, дзядзуля памёр...

А ў нас пачалася малярыя. Я хварэла мацней за ўсіх, выратавала толькі тое, што з бальніцы пачалі насіць хінін у парашках. Горкі, але выратавальны. Як толькі ачунялі ад малярыі, пачалі капаць зямлю і нешта сеяць. Бабуля здабывала па вёсках і далёкіх родзічах насенне, а мы капалі зямлю. Раніцай нас мама будзіць на працу, а есці — нямашака. Як толькі трохі адрасла крапіва — пачалі яе шчыкаць і варыць. Потым пайшло шчаўе. Бабуля рвала траву пад назвай «гуголь» — зараз такой травы ў Сталцы няма. Мо тады з'елі, а мо і перарадзілася.

Бабуля яшчэ прыдумала пячы праснакі. Мы хадзілі ў лес, збіралі леташні верас, сухое лісце папараці, дома іх падсушвалі на печы, замешвалі звараную траву і пяклі ў печы, якую паспеў зрабіць дзядуля. Атрымлівалася чорная кашка — вось гэта і быў хлеб да шчаўя. Гнілой бульбы, якую збіралі іншыя людзі, у нас не было. У такіх умовах і сустрэлі Перамогу. Была вялікая ціхая радасць. А вось ад бацькі лістоў не было...

Працаваць трэба было кожны дзень. Усе дзеці былі на гародзе: адзін капае рыдлёўкай, другі вытрасае дзёран. Ускапаем кавалак, бабуля сее, а я з сястрой Марыяй цягаем барану. А вось для пасадкі бульбы трэба было цягаць плуг. Штораніцы 8-10 жанчын і падлеткаў збіраліся, цягалі па чарзе плуг: палку пакладзеш на жывот, сагнешся і цягнеш усім целам...

А восьмай гадзіне раніцы маці трэба было ісці ў калгас на працу. Яна заключалася ў тым, што жанчыны ішлі за 10 кіламетраў на станцыю «Роста», там ім насыпалі па 16 кілаграмаў збожжа, яны чаплялі торбы лямкамі за плечы і неслі ў вёску для пасеву на калгасныя палі. У кладоўцы ўзважвалі збожжа, каб ніхто нічога не ўзяў. І так кожны дзень. У калгасе не было ніводнага каня. Як жа жанчыны маглі вытрымліваць такую нагрузку галоднымі?..

А мы тым часам цягалі плуг, барану і засявалі па кавалачку зямлі — у выніку атрымалася 50 сотак бабулінай і 20 сотак нашай. Хаця бульбу бабуля рэзала па вочках, яна ўся ўзышла. Гэта была радасць, надзея і імкненне дажыць да новага ўраджаю. Дажылі.

## Эпілог

Увосень 1945 года мы пайшлі ў школу: спачатку ў адну ацалелую хату, потым — за 5-6 кіламетраў. Атрымалі паведамленне пра гібель таты і 72 рублі пенсіі на 5 дзяцей. Потым прыйшлі паведамленні, што ўсе тры сыны бабулі загінулі, і ёй прызначана пенсія 112 рублёў. Шклянка солі тады каштавала 30 рублёў. Аднак за гэтыя грошы мы змаглі набыць каму фуфайку, каму буркі з бахіламі. Восенню 1945 года нам далі нямецкую карову — гэта было ўжо шчасце.

Бабуля вельмі хацела, каб мы вучыліся. Не маючы ніводнага класа адукацыі, яна правярала нашы ўрокі. Я адна з аднагодкаў паступіла ў Магілёўскае педвучылішча і скончыла яго. Стыпендыя ў 140-180 рублёў была вялікай падтрымкай для ўсёй сям'і. На харчы я гэтыя грошы амаль не траціла. Матуля мне на тыдзень давала бохан свайго хлеба, бітончык з двума літрамі малака і слоік смятаны.

У дзядулевай хаце мы выраслі і адгулялі два вяселлі — сястры Мані і брата Мішы. І толькі калі Лёша адслужыў у войску, яны ўсе разам пабудавалі новую хату: лес дзяржава выдала бясплатна, а астатняе — іх праца.

## Пасля напісанага

Вось, здаецца, і ўсё, што захавалася ў маёй памяці і што я змагла расказаць. Аднак вайна для маёй сям'і і маіх землякоў яшчэ не скончана. Мама памерла ў 67 гадоў ад інфаркту Здавалася б, які інфаркт у сельскай мясцовасці?.. Мы, дзеці, не зведаўшыя дзяцінства, а толькі 4 гады жаху, голаду, холаду і невыноснай працы, не маглі вырасці з добрым запасам жыццёвай моцы і разлічваць на доўгі век. Брат Міша памёр у 57 гадоў таксама ад інфаркту...

Азіраешся на пражыты жыццёвы шлях, аналізуеш і думаеш: адкуль жа бралі сілы нашы бацькі, каб ратаваць дзяцей? Адкуль у іх была ўпэўненасць, што вызваленне прыйдзе? Нават у тых Азарычскіх балотах яны спадзяваліся выжыць, хаця не мелі магчымасці нават хлеба пакласці ў рот дзіцяці.

Страшнае, галоднае дзяцінства наклала адбітак на наша дарослае жыццё. Мала хто з нашых бацькоў вярнуўся з вайны. Загінулі і маладыя хлопцы. Дзяўчатам, якія былі сагнаныя на цяжкія працы ў Германію, не было за каго выходзіць замуж. Толькі з найбліжэйшых вуліц я магу пералічыць шмат дзяўчат, хто не выйшаў замуж або не змог завесці дзяцей.

Я лічу, што дзяўчаткі, якія ў 12-14 гадоў перажылі гэтыя жахі, не толькі самі сыходзяць з жыцця, але і былі няздольнымі даць сваім дзецям здаровага доўгага веку. Мы, дзеці вайны, асабліва сіроты, у якіх не вярнуўся бацька ці якія засталіся без маці, увесь час зайздросцілі тым, хто вярнуўся з вайны, і іх сем'ям: яны ўсё жыццё жылі ў пашане, іх дзеці мелі любоў і шчасце, былі сытыя, абутыя, ім не трэба было думаць пра хлеб надзённы...

Вайна — гэта заўсёды страшна. Сёння можна пачуць размовы: хопіць казаць пра вайну, трэба ўсё забыць. А як забыць? Не забываецца!

**Таццяна ЛІСКОВА.**

# КАРАЛЕЎСКІЯ ПТУШКІ РАДУЮЦЦА СВЯТУ



**Менавіта ў Дзень Незалежнасці Беларусі лебедзі — 10 белых і два чорныя — былі выпушчаны на ваду ў штучнае возера, што знаходзіцца на тэрыторыі Гомельскага палаца-паркавага ансамбля. Падарунак ацанілі больш за пяць тысяч гамяльчан, якія выйшлі ў гэты дзень на вуліцы абласнога цэнтра, каб прыняць удзел у святочных мерапрыемствах.**

Здаецца, гамяльчане да апошняга дня не верылі, што менавіта да свята завершацца работы па рэканструкцыі знакамітага Лебядзінага возера ў цэнтральным парку Гомеля — своеасаблівым сімвале горада і адным з самых любімых месцаў адпачынку. Яшчэ пры Паскевічу рэчышча старажытнай ракі Гамяюк у XIX стагоддзі было пераўтворана ў штучнае возера. Зараз тут праведзены засыпка і ўмацаванне адхонаў, бетаніраванне і абліцоўка маналітных сцен, пабудаваны водны каскад. Акрамя таго, адрамантаваны пешаходны масток і высаджана больш за 10 тысяч кветак.

Але ж традыцыям гамяльчане не здрадзілі, і свята Незалежнасці пачалося са святочнага шэсця па цэнтральнай — Савецкай — вуліцы горада. 60 вайскоўцаў урачыста пранеслі вялізнае «Палатно Перамогі». Гэта акцыя стартавала яшчэ ў лютым гэтага года. Піянеры наведалі ўсіх ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія жывуць на Гомельшчыне. На кавалках кумача сталыя людзі напісалі свае прозвішчы, баявы шлях і ўзнагароды. Абласное палатно налічвае 5,5 тысячы кавалкаў і ў даўжыню складае больш за 33 метраў.





— Некаторыя ветэраны не дажылі да сённяшняга дня, але ж іх словы, напісаныя на палатне, застануцца для нашчадкаў назаўсёды, — гаворыць старшыня Гомельскага абласнога Савета Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі Раман Сматрэнка.

Толькі сёлета былі вызначаны імёны 96 воінаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Гомельскай вобласці і былі пахаваныя як невядомыя абаронцы Айчыны. Па інфармацыі ваеннага камісарыята Гомельскай вобласці, вызначыць імёны стала магчыма дзякуючы рабоце з архіўнымі дакументамі і дзейнасці 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны. Зараз прозвішчы байцоў будуць уносіцца на памятныя знакі ў месцах брацкіх магіл. Акрамя таго, аб месцах пахаванняў раней невядомых салдат паведамілі сваякам. Тым не менш, на сённяшні дзень імёны больш чым 45 тысяч воінаў, якія загінулі на Гомельшчыне, застаюцца невядомымі.

А напярэдадні 30 гомельскіх ветэранаў «з ветрыкам» па горадзе пракацілі байкеры. Аўтакалона прайшла па месцах баявой славы. Дзесяць аўтамашын старога ўзору з георгіеўскімі стужачкамі праехалі праз самыя памятныя для людзей вайны месцы: мемарыял «Вечны агонь», Курган Славы і Навабеліцкія брацкія могілкі.

— Для мяне гэта вельмі важнае свята, — гаворыць ветэран Вялікай Айчыннай вайны і прыхільнік газеты «Звязда» Мікалай Яжоў. — Мне ўсё вельмі падабаецца. Нават надвор'е, глядзіце, якое добрае — святочнае.

V рэгіянальны конкурс харавога мастацтва «Пеўчае поле-2009» прайшоў у абласным цэнтры ў дзень галоўных урачыстасцяў. У ім прынялі ўдзел больш за тысячу вакалістаў. Песенны марафон ішоў на працягу двух з паловай гадзін. Харавыя калектывы прынялі ўдзел і ў рэспубліканскай акцыі «Спяём гімн разам!», якая стала завяршальным акордам святкавання дня Незалежнасці ў Гомелі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара.**

# У ЖАМЧУЖНЫМ АДКРЫЛІ ПОМНІК

Самай значнай падзеяй у Баранавіцкім раёне падчас святкавання Дня Незалежнасці было адкрыццё помніка ў гонар 65-ай гадавіны вызвалення Беларусі.

Помнік усталяваны ў пасёлку Жамчужным насупраць Дома культуры.



Былыя франтавікі — Канстанцін РАМАНКО і Франц КАРЛЮК.

3 ліпеня тут сабраўся актыў раёна, ветэраны і франтавікі, жыхары пасёлка, вёскі Новая Мыш і іншых населеных пунктаў.

Кіраўніцтва раёна пастаралася, каб гэты дзень стаў сапраўдным святам для ўсіх, хто прыйшоў на яго.

А першымі з ветэранаў вайны на свята прыбылі Канстанцін Раманко і Франц Карлюк — франтавікі-інваліды. Іх з в. Цешаўля ў Жамчужны прывезлі на дзяржаўнай машыне, гэты факт былыя салдаты адзначылі.

А як сёння жывуць франтавікі?

— Пасля таго, што давялося пражыць на вайне, наракаць не прыходзіцца, — сказаў Канстанцін Фёдаравіч.

— Вядома, хацелася б, каб яшчэ лепш было, бо і ўнукам яшчэ трэба дапамагчы, — дадаў Франц Іванавіч.

На свяце прысутнічала шмат людзей, але ветэранаў вайны было некалькі дзясяткаў. З кожным годам іх усё менш і менш. І штосьці змяніць тут немагчыма.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**



Помнік.

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

**по продаже государственного имущества и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества**

| Наименование предмета аукциона | Здание гаража и право заключения договора аренды земельного участка | Незавершенное законсервированное капитальное строение (пристройка к жилому дому) и право заключения договора аренды земельного участка | Незавершенное законсервированное капитальное строение (незавершенный строительством военно-учебный сборный пункт областного военного комиссариата) и право заключения договора аренды земельного участка | Здание хозпостройки № 2 и право заключения договора аренды земельного участка | Здание художественной мастерской и право заключения договора аренды земельного участка | Здание неустановленного назначения и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская область, г. Кобрин, ул. Жукова, 11 а | Брестская область, г. Лунинец, ул. Блока, д. 2 | г. Брест, ул. Пионерская, д. 40/3 | г. Брест, ул. Шоссейная, 2 | Брестская область, г. Пинск, ул. Красноармейская, 29 «а» | Брестская область, г. Пинск, ул. Ильина, 2 «а» |
| Продавец недвижимого имущества | КУМПП ЖКХ «Кобринское ЖКХ» тел. (01642) 2 38 91 | КУМПП ЖКХ «Лунинецкое ЖКХ», тел. (01647) 3 10 66 | КУП «Брест горУКС», тел. (0162) 23 66 64 | ТПУКП «Плодоовощ», тел. (0162) 45 36 64 | Отдел культуры Пинского горисполкома, тел.: (0165) 35 38 72, 35 38 52 | КУПП «Жилищно-коммунальное хозяйство» тел.: (0165) 35 32 64, 35 68 76 |
| Сведения о предмете аукциона | Здание гаража (инв. № 123/С-24162, 1-эт., 1995 г.п., общая площадь – 47,2 кв.м, фундамент бетонный, стены кирпичные, крыша совмещенная, перекрытия ж/б, имеется электроснабжение). Земельный участок площадью 0,0084 га; срок аренды – 50 лет. | Незавершенное законсервированное капитальное строение (пристройка к жилому дому) (инв. № 133/U-15111, 3-эт., площадь строения – 2874,7 кв.м, готовность строения – 56 %, в т.ч. 100 % готовность: фундамент – бетонные блоки, стены – кирпич, перегородки – кирпич, перекрытия ж/бет., кровля совмещенная рулонная. 25 % готовности – отделочные работы, снаружи частично оштукатурено. Земельный участок площадью 0,2514 га; использование земельного участка для размещения объектов общественного питания, торговли и услуг; срок аренды – 99 лет. | Незавершенное законсервированное капитальное строение с инв. № 100/U-51855 (незавершенный строительством военно-учебный сборный пункт областного военного комиссариата, общ. площадь строения по техпаспорту – 486,7 кв.м, 2-этажн., готовность строения 9 %. Земельный участок площадью 0,1100 га, использование земельного участка для размещения объектов социально-культурного назначения, срок аренды – 20 лет. | Капитальное строение с инв. № 100/С-43996 (здание хозпостройки № 2), общ. площадь 12,2 кв.м, 1-этажн., 1980 г.п., фундамент бетонный, стены кирпичные, крыша совмещенная с перекрытием. Земельный участок площадью 0,0169 га, использовать для размещения объекта производственно-складского назначения, срок аренды – 20 лет. | Капитальное строение с инв. № 130/С-32233 (здание художественной мастерской), одноэт., общ. площадь – 444,1 кв.м, фундамент кирпичный, стены кирпичные, крыша шиферная. Земельный участок площадью 0,0890 га, срок аренды – 99 лет. | Капитальное строение с инв. № 130/С-34137 (здание неустановленного назначения), одноэт., общ. площадь – 177,7 кв.м, фундамент бетонный, стены кирпичные, крыша совмещенная. Земельный участок площадью 0,0270 га, срок аренды – 99 лет. |
| Условия использования недвижимого имущества | Завершить до 1 декабря 2009 г.: ремонт фасадов и крыши, благоустройство прилегающей территории. | – | возместить КУП «Брест горУКС» расходы по оформлению правоустанавливающих документов на объект и земельный участок в сумме 392 000 рублей в течение десяти календарных дней с даты заключения договора купли-продажи | возместить ТПУКП «Плодоовощ» расходы по оформлению правоустанавливающих документов на объект и земельный участок в сумме 1 008 617 рублей в течение десяти календарных дней с даты заключения договора купли-продажи | – | без права размещения объекта игорного бизнеса и промышленного производства |
| Начальная цена предмета аукциона, руб. | 17 287 180 | 1 248 684 243 | 837 688 615 | 13 667 858 | 215 624 580 | 179 818 850 |
| Сумма задатка, руб. | 1 728 700 | 124 868 400 | 83 768 800 | 1 366 780 | 21 562 450 | 17 981 880 |
| Организатор аукциона | Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11 *тел. (0162) 23 44 06, 21 19 82, 23 12 63, 20 87 85,* www.brest-region.by, fond@brest-region.by | | | | | |

Аукцион состоится **7 августа 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Для участия в аукционе представляются**:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество» с необходимыми документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

негосударственным юридическим лицом Республики Беларусь, индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

при подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Не допускается одновременное участие в торгах по одному и тому же предмету аукциона следующих лиц: близких родственников (родителей, детей, усыновителей, усыновленных (удочеренных), родных братьев и сестер, деда, бабки, внуков), а также супругов и их близких родственников; юридических лиц, в уставном фонде которых одно и то же юридическое или физическое лицо имеет долю в размере двадцати и более процентов; юридических лиц, одно из которых в соответствии с законодательством признается дочерним или зависимым по отношению к другому.

**Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан**: подписать протокол о результатах аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы по формированию, изменению и прекращением существования земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении земельного участка; возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

**Заявления на участие в аукционе с необходимым пакетом документов принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 6 августа 2009 года включительно.**

# Ушанавалі і матроса з «Аўроры»...

**У Віцебску і ў вобласці святкаванне Дня Незалежнасці было па сваім маштабе такое, як ніколі раней. І ў глыбінцы адбыліся вельмі знакавыя падзеі.**

— Мы ў ганаровай абстаноўцы адкрылі ў пасёлку Копці, дзе я жыву, — гэта недалёка ад Віцебска — помнік матросу з легендарнага крэйсера «Аўрора». Матрос Дзенісенка Філіп Агеевіч — наш зямляк. Прызываўся на службу ў царскую армію менавіта з Копцяў, — распавядае 84-гадовы **ветэран Вялікай Айчынай вайны Цярэшчанка Віктар Дзям'янавіч** — старшыня Капцянскай ветэранскай арганізацыі Віцебскага раёна. — Дзенісенка і Зімні палац штурмаваў, і ўсю вайну прайшоў. Усяго ў нас у пасёлку я і мае аднадумцы паставілі ўжо каля трыццаці розных помнікаў у памятным воінскім мемарыяле імя Ленінскага камсамола... Я ваяваў у складзе 1-га Украінскага фронту. Вызваляў Украіну, Польшчу. І ў Берліне мы з таварышамі змагаліся з фашыстамі. А вайна скончылася для мяне 12 мая 1945 года ў Празе... Цяпер мы хочам паставіць помнік яшчэ адной нашай зямлячцы. Ганна Мікалаеўна Мамонава, хірург-стаматолаг, зрабіла аперацыю савецкаму лётчыку Багданаву. Потым ён стаў камандзірам палка. Немцы за гэта яе і трох яе малых дзяцей расстралялі ў 1943 годзе. Ёсць у Копцях магіла. Спадзяёмся на падтрымку ва ўвекавечанні яе памяці з боку Саюзнай дзяржавы...

У Віцебску святкаванне Дня Незалежнасці маштабным размахам здзівіла многіх, нават старажылаў. Тут па самых сціплых падліках узялі ўдзел мінімум 10 тысяч чалавек. Гэта — рэкорд за ўсе гады святкавання незалежнасці.

Упершыню на рэчышчы ракі Віцьба, у гонар якой атрымаў назву горад, правялі воднае свята. Выступілі самадзейныя студыі і ансамблі. Тут можна было ўбачыць рыцараў, якія перанеслі гледачоў у часы сярэднявечча, паказалі баі. Парашутысты, міліцыянеры-кінолагі, выратавальнікі прадэманстравалі сваё майстэрства падчас паказальных выступленняў. А, бадай, самай цікавай падзеяй стала абяцанае раней з'яўленне на свяце княжны Вольгі — той самай, якая заснавала Віцебск. Яна прыплыла на лодцы, літаральна як і тады, калі вырашыла заснаваць горад (у X стагоддзі).

І ў цэнтры народных рамёстваў «Задзвінне» арганізавалі работу «Горада майстроў» пад суправаджэнне народных калектываў самадзейнасці.

Запытаў я ў мясцовых жыхароў, які ў іх настрой.

— Вельмі добры. Мы вось з сябрамі, якія прыехалі да мяне ў госці з Магілёўскай вобласці, гуляем, я ім горад паказваю. І ганаруся, што тут жыву! — расказвае **Алена Крывіцкая**, хатняя гаспадыня. — Прыгожа вакол. Цікава ў горадзе можна правесці гэты выхадны дзень.

— Зразумела, святочны настрой! — адказвае **студэнт Уладзімір Лапіцкі**. — Вось збіраемся ў парк імя Савецкай Арміі, дзе пройдзе масавае гулянне. А ўвечар пойдзем на плошчу Тысячагоддзя на канцэрт «Натхняй з МТС».

Святкаванне расцягваецца фактычна на некалькі дзён.

— І ў гарадскім заапарку мы спецыяльна для свята падрыхтавалі цікавую праграму, конкурсы для дзяцей і дарослых. Гіры можна будзе пападымаць, у баскетбол і іншае згуляць — ёсць усё, каб цікава прабавіць час, — расказвае **дырэктар Аляксей Андрэйкоў**. — Вельмі стараемся, каб свята запомнілася надоўга.

Старажытны горад, дзякуючы намаганням мясцовых уладаў і асабіста старшыні Віцебскага аблвыканкама Аляксандра Косінца, быццам бы памаладзеў. Губернатар паабяцаў гараджанам, што на вуліцах павінна быць чыста і ўтульна, як дома.

Сімвалічна, што плошча Перамогі, што лічыцца адной з самых вялікіх у Еўропе, становіцца ў Віцебску галоўнай. Яе рэканструкцыю плануюць завяршыць, не зацягваючы надоўга. Тут будуць створаны сучасныя зоны адпачынку з фантанамі, усёй неабходнай для правядзення масавых акцый інфраструктурай. І ў выніку юбілей Перамогі будзе яшчэ больш цікавым і нечаканым.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# МІНТРАНС ПЛАНУЕ БУДАВАЦЬ НОВЫЯ ГІДРАЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ І КРУІЗНЫЯ ЛАЙНЕРЫ

### КАПЕЙКА РУБЕЛЬ БЕРАЖЭ

У найбліжэйшыя 10 гадоў у Беларусі будзе пабудавана 12 малых гідраэлектрастанцый. Пра гэта паведаміў **начальнік упраўлення марскога і рачнога транспарту Міністэрства транспарту і камунікацый Беларусі Браніслаў ГАВАРОЎСКІ**. Ён патлумачыў, што на тэрыторыі нашай краіны існуе 12 вузлоў на Днепра-Бугскім канале, якія маюць розныя напоры: ад 2,5 да 4,5 метра. Вузлы — гэта перапады вышыні вады, энергію якіх можна выкарыстоўваць на ГЭС. На ўсіх 12 вузлах будуць пабудаваныя гідраэлектрастанцыі.

— Мы ўжо ўзвялі каля Пінска адну малую ГЭС магутнасцю 1,3 КВт, — адзначыў Браніслаў Гавароўскі. — Зараз будуем у Кобрыне. Да канца года яе павінны здаць. Такім чынам у энергасістэму рэспублікі будзе пастаўляцца 15-20 тысяч КВт электраэнергіі. Гэта невялікая доля для энергетыкі ўсёй краіны. Але калі кожнае прадпрыемства будзе імкнуцца шукаць альтэрнатыўныя крыніцы, тым больш крыніцы энергіі, якія аднаўляюцца, то ў скарбонцы рэспублікі будзе назапашвацца энергія, якая дазволіць Беларусі існаваць незалежна ад іншых краін.

### АДНОЎЛЕНЫ АЎГУСТОЎСКІ КАНАЛ ПРЫЦЯГНЕ ТУРЫСТАЎ З ПОЛЬШЧЫ І ЛІТВЫ

Таксама Браніслаў Гавароўскі паведаміў, што завяршаецца рэканструкцыя Аўгустоўскага канала. Застаецца закончыць рэканструкцыю суднаходнага шлюза на польскай тэрыторыі. Зараз вырашаецца пытанне аб будаўніцтве пункта пропуску на польскім баку. Перамовы вядзе Гродзенскі аблвыканкам.

— На сёння на Аўгустоўскім канале праведзена рэстаўрацыя старых шлюзаў, — удакладніў Браніслаў Гавароўскі. — Збудаваны прычал для захоўвання і абслугоўвання малых маторных лодак і байдарачнікаў. Каб прыцягнуць турыстаў не толькі прыгожымі мясцінамі, але і месцамі адпачынку, перад Гродзенскім аблвыканкамам стаіць задача стварэння інфраструктуры: гасцініц, кэмпінгаў, забаўляльных цэнтраў. Усяго на рэканструкцыю Аўгустоўскага канала выдаткавана прыкладна 30 млрд беларускіх рублёў.

Нядаўна было падпісана пагадненне з літоўскім Мінтрансам аб суднаходстве па ўнутраных водных шляхах. Гэты дакумент будзе спрыяць усталяванню турыстычнага патоку і пасажыраперавозак паміж Беларуссю, Польшчай і Літвой. Літва са свайго боку выказала зацікаўленасць у добраўпарадкаванні Аўгустоўскага канала і ракі Нёман на поўначы Беларусі.

### ДА БУДАЎНІЦТВА КРУІЗНЫХ ЛАЙНЕРАЎ ТРЭБА ДАЛУЧАЦЬ ТУРФІРМЫ

Аднак сёння водныя падарожжы і круізы ў Беларусі — гэта рэдкасць. У нашай краіне ёсць 24 пасажырскія судны змяшчальнасцю 40-250 чалавек. Гэта судны для аднадзённых перавозак — яны не абсталяваныя спецыяльнымі каютамі.

— Ёсць планы і магчымасць будаваць круізныя судны на беларускіх суднабудаўнічых заводах, — падзяліўся Браніслаў Гавароўскі, — але яны павінны быць запатрабаванымі. 24 пасажырскія судны, якія мае Мінтранс, не загружаны цалкам. У сувязі з асаблівасцямі клімату судны працуюць толькі пяць месяцаў у год. Ці можа за такі перыяд акупіць сябе вялікі круізны лайнер? Для таго, каб будаўніцтва такіх суднаў стала рэнтабельным, да справы трэба падключаць турыстычныя кампаніі. Напрыклад, арганізаваць паездку па маршруце Брэст-Кіеў плануе Брэсцкі аблвыканкам. Ён дамаўляецца са сваімі турфірмамі і шукае сродкі на будаўніцтва. Турыстычныя арганізацыі маглі б выкарыстоўваць гэтыя судны ў летні час для паездак, а ў зімовы — у якасці гасцініц.

**Вера КАПІТАНАВА.**



(8 017) 287 19 68

# Прапісаў. Цяпер шкадую

***У 1987 годзе я даў згоду на прапіску дарослай жончынай дачкі ў свой дом, які набыў да рэгістрацыі шлюбу. Мне абяцалі, што яна пажыве з намі да замужжа. З жонкай мы агульных дзяцей не мелі. З 2000 года нашы шлюбныя адносіны спыніліся, а ў 2005 годзе мы развяліся. Жончына дачка з маёй жылплошчы выпісвацца адмаўляецца, хоць жыве са сваёй сям'ёй у купленай імі кватэры, якую зарэгістравалі на маці. Яна матывуе адмову адсутнасцю ўласнага жылля і правам карыстацца маім жыллём, бо там знаходзяцца яе рэчы. Пры гэтым я не магу карыстацца сваім жыллём, яна не аддае мне ключ ад дома і дакументы. Жыву цяпер з іншай жанчынай у яе кватэры. Хацеў прадаць свой дом, але без яе згоды не маю права. Ці ёсць закон, які дазваляе ўласніку скасаваць дагавор на прапіску членаў сям'і, якія на сённяшні дзень членамі сям'і не з'яўляюцца?***

**В.В.**, *г. Гродна*

Як устаноўлена артыкулам 116 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь, члены сям'і ўласніка жылога памяшкання маюць роўнае з ім права карыстання жылым памяшканнем, калі пры іх усяленні не было іншага пісьмовага пагаднення. Калі яны перасталі быць членамі сям'і ўласніка, але працягваюць жыць у гэтым жылым памяшканні, яны захоўваюць свае правы і абавязкі, калі іншае не ўстаноўлена Жыллёвым кодэксам і заключаным з імі пісьмовым пагадненнем аб парадку карыстання жылым памяшканнем.

У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7.09.2007 г. № 413 «Аб удасканаленні сістэмы ўліку грамадзян па месцы жыхарства і месцы прабывання» грамадзяне лічацца зарэгістраванымі па месцы жыхарства згодна пастаяннай прапісцы і ў іх захоўваюцца правы і абавязкі, якія ўзніклі ў сувязі з пастаяннай прапіскай.

У пункце 37 Палажэння, якое зацверджана гэтым Указам, пералічаны выпадкі, калі орган рэгістрацыі здымае грамадзяніна з рэгістрацыйнага ўліку. Гэта, напрыклад, змяненне грамадзянінам свайго месца жыхарства. Падставай для зняцця з уліку ў гэтым выпадку з'яўляецца паведамленне органа рэгістрацыі, які зарэгістраваў грамадзяніна па новым месцы жыхарства. Але паколькі дачка вашай былой жонкі не рэгіструецца па месцы жыхарства ў кватэры маці, то, згодна з пунктам 37, орган рэгістрацыі можа зняць яе з рэгістрацыйнага ўліку ў выпадку высялення з займаемага жылога памяшкання або прызнання яе страціўшай права карыстання жылым памяшканнем на падставе копіі (выпіскі з) уступіўшага ў сілу адпаведнага рашэння суда.

Высяленне членаў сям'і ўласніка жылога памяшкання, якія не маюць права ўласнасці на долю ў жылым памяшканні, у адпаведнасці з артыкулам 120 Жыллёвага кодэкса, можа адбывацца ў судовым парадку на падставах, прадугледжаных артыкулам 39 Жыллёвага кодэкса (за сістэматычнае разбурэнне ці порчу жылога памяшкання, выкарыстанне яго не па прызначэнні, сістэматычнае парушэнне правілаў карыстання жылым памяшканнем), або на падставе пісьмовага пагаднення пры ўсяленні, якое не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь. Калі члены сям'і ўласніка маюць у гэтым населеным пункце іншае жылое памяшканне, што належыць ім на праве ўласнасці, то па патрабаванні ўласніка яны падлягаюць высяленню ў гэта жылое памяшканне. Таксама яны могуць быць выселены па патрабаванні ўласніка ў жылое памяшканне, набытае ім за кошт уласных сродкаў.

Згодна з часткай другой артыкула 37 Жыллёвага кодэкса, пры выездзе наймальніка і членаў яго сям'і на пастаяннае месца жыхарства ў іншае жылое памяшканне дагавор найма раней займаемага жылога памяшкання лічыцца скасаваным. На падставе гэтага артыкула вы можаце звярнуцца ў суд з іскам аб прызнанні дачкі вашай былой жонкі страціўшай права карыстання жылым памяшканнем у сувязі з яе выездам на пастаяннае месца жыхарства ў іншае жылое памяшканне. Але атрымаць задавальняючае вас рашэнне суда будзе даволі складана. Вам неабходна будзе прывесці доказы не толькі таго, што па месцы рэгістрацыі яна не жыве, але і таго, што ў іншае жылое памяшканне яна выбыла на пастаяннае жыхарства. Суд прыцягне да ўдзелу ў справе і вашу былую жонку як уласніцу жылога памяшкання, дзе цяпер жыве яе дачка. Вам неабходна дапамога адваката для збору такіх доказаў і, пры іх наяўнасці, для падрыхтоўкі адпаведнага іска.

Артыкулам 123 Жыллёвага кодэкса ўстаноўлена, што ўласнік жылога памяшкання ажыццяўляе яго адчужэнне на падставах і ў парадку, устаноўленых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Пры адчужэнні або залогу жылога памяшкання патрабуецца згода ўсіх поўнагадовых членаў сям'і ўласніка, якія пражываюць сумесна з ім і маюць права карыстання жылым памяшканнем.

Калі вам перашкаджаюць карыстацца ўласным жыллём, не даюць ключы, дакументы, вы маеце права ў судовым парадку патрабаваць устаранення ўсякіх парушэнняў вашых правоў, хоць гэтыя парушэнні і не былі звязаны з пазбаўленнем валодання. На такія патрабаванні іскавая даўнасць не распаўсюджваецца (артыкулы 285, 209 Грамадзянскага кодэкса).

На сённяшні дзень існуе менавіта такое заканадаўства ў гэтай сферы. Якім будзе жыллёвае заканадаўства далей – пакажа час. Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2.02.2009 г. № 133 зацверджаны План падрыхтоўкі (удзелу ў падрыхтоўцы) законапраектаў рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання на 2009 год. Гэтым Планам прадугледжана і распрацоўка праекта новага Жыллёвага кодэкса.

# Чакаецца падзенне закупачных цэнаў...

**Прадпрыемствы Белспажыўсаюза пачалі рыхтавацца да масавага сезона нарыхтоўкі прадукцыі новага ўраджаю. У іх планах — закупіць сёлета ў насельніцтва сельскагаспадарчай прадукцыі на суму больш як Br 200 млрд.**

— Мы пастараемся падтрымаць леташні ўзровень нарыхтовак, але сёлета зрабіць гэта будзе не так проста, — адзначыў **старшыня праўлення Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў Уладзімір КУЛЯШОЎ**. — Прычына ў тым, што ў сувязі з сусветным фінансава-эканамічным крызісам чакаецца зніжэнне закупачных цэнаў на сельгаспрадукцыю, так, як гэта адбылося з закупачнымі цэнамі на малако.

Каб выжыць падчас складанай эканамічнай сітуацыі, вытворца павінен «вярцецца». Можна скарачаць работнікаў, зніжаць зарплату, але большасць перапрацоўшчыкаў імкнуцца набываць сыравіну па больш нізкіх цэнах. Сёння гэта пытанне актыўна абмяркоўваецца. І, паводле слоў Уладзіміра Куляшова, які бярэ ўдзел у перамовах, ёсць усе перадумовы для таго, што закупачныя цэны будуць трымацца на ўзроўні мінулага года, ці апусцяцца на рублёў 300-400.

— Калі так здарыцца, не сумняваюся, людзі будуць каціць усе бочкі на нарыхтоўшчыка. Але ці задумаецца хто-небудзь, што наша закупачная цана на сельгассыравіну напрамую звязана з прыёмнай цаной? Калі ў нас сёлета будуць прымаць прадукцыю па тысячы рублёў за кілаграм, умоўна, то ўжо трымаць планку мінулага года мы не зможам. Хто ж захоча весці стратную дзейнасць?

Прасцей, паводле слоў старшыні праўлення Белспажыўсаюза, закупіць сыравіну ў гаспадарак оптам.

— Але мы не даём магчымасці нашым арганізацыям прыкрывацца нарыхтоўкамі ад грамадскага сектара, наносячы шкоду інтарэсам насельніцтва. Галоўны крытэрый ацэнкі работы нарыхтоўчай галіны — гэта нарыхтоўка ад насельніцтва. Акрамя таго, ні для каго не сакрэт, што калі мы хочам нарыхтоўваць прадукцыю, то павінны адразу і ў поўным аб'ёме плаціць людзям грошы за здадзеную сыравіну. Таму вялікія спадзяванні ўскладаем на банкаўскія льготныя крэдыты для фінансавання закупак сельгаспрадукцыі ў насельніцтва. Іх памер павінен скласці прыкладна Br68 млрд. Думаю, што ў найбліжэйшы час адпаведны ўказ будзе падпісаны.

Летась, дзякуючы выдзеленым беларускімі банкамі сродкам, Белспажыўсаюз змог забяспечыць своечасовую аплату за сельгапрадукцыю і павялічыць аб'ёмы нарыхтовак.

**Надзея ДРЫЛА.**

## Чаму падчас святаў не звальняюць сына? Пытальнік

***«Нас з мужам непакоіць забарона звальнення вайскоўцаў тэрміновай службы падчас святаў, у прыватнасці нашага сына. Ён служыць у адной з часцей ППА. Як і любая маці, я вельмі люблю свайго сына і даражу тымі хвілінамі, калі ён побач. І мне хацелася б адзначыць свята ў родным горадзе разам са сваімі дзецьмі. Але я пазбаўленая такой магчымасці. Растлумачце, чаму?***

**А. Раўкова,** *г. Мінск.*

Нам адказаў **начальнік аддзела інфармацыі і сувязяў з грамадскасцю ўпраўлення інфармацыі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны палкоўнік Вячаслаў РАМЕНЬЧЫК**.

— У адпаведнасці са Статутам унутранай службы Узброеных Сілаў, звальненне вайскоўцам тэрміновай службы можа прадастаўляцца ў перадвыхадныя, выхадныя, перадсвяточныя і святочныя дні рашэннем камандзіра часці. Звальненне да 3 сутак з выездам за межы ваеннага гарнізона з'яўляецца відам заахвочвання, якое аб'яўляецца тым вайскоўцам, якія вызначыліся па службе. Калі ваш сын не мае адзнак па службе, камандзір мае права не заахвочваць яго звальненнем з выездам за межы гарнізона. Выказваем упэўненасць, што ваш сын яшчэ праявіць сябе ў працэсе баявой падрыхтоўкі і не раз наведае сваіх бацькоў.

Лепшыя ДАІшнікі — у Мінску

# ЗА ЗВАННЕ ЛЕПШАЙ ПАТРУЛЬНАЙ СЛУЖБЫ БЕЛАРУСІ ЗМАГАЛАСЯ 8 КАМАНДАЎ

У Полацку ў 12-ы раз прайшоў рэспубліканскі агляд-конкурс прафесійнага майстэрства супрацоўнікаў дарожна-патрульнай службы ДАІ

Як расказаў карэспандэнту «Звязды» **начальнік УДАІ МУС Рэспублікі Беларусь палкоўнік Юрый ЛІТВІН**, у Полацк з'ехаліся пераможцы абласных спаборніцтваў — лепшыя ДАІшнікі ў сваім рэгіёне. Разам з імі за званне лепшых змагаліся таксама каманды з Расіі, Украіны, Літвы і Малдовы.

Конкурс праходзіў тры дні і складаўся з шэрагу этапаў: веданне Правілаў дарожнага руху, хуткаснае манеўраванне на матацыкле і легкавым аўтамабілі, агнявая падрыхтоўка, баявыя прыёмы барацьбы, ручное рэгуляванне дарожнага руху, міліцэйскі біятлон і інш.

**Начальнік арганізацыйнага аддзела дарожнай паліцыі Літвы Яўнюс МАЛІНАЎСКАС расказаў «Звяздзе»**, што ў Літве аналагічныя конкурсы праходзяць крыху інакш.

— Падобныя мерапрыемствы арганізуюцца і ў Літве, адзін раз на год. Але пераважна — гэта спаборніцтвы сілавой часткі. Вялікую ўвагу надаём спартыўнай падрыхтоўцы, у прыватнасці, такім відам спорту, як баскетбол.

А з Расіі сёлета прыехала каманда пераможцаў аналагічных спаборніцтваў сярод ДПС ДАІ нашай усходняй суседкі — супрацоўнікі ДПС Татарстана, Маскоўскай і Разанскай абласцей. **Намеснік начальніка аддзела арганізацыі і каардынацыі дзейнасці ДПС Дэпартамента забеспячэння бяспекі дарожнага руху МУС Расійскай Федэрацыі палкоўнік міліцыі Канстанцін ЖАВАРАНКАЎ** адзначыў, што расійскі аналаг беларускага конкурсу мае назву «Усерасійскі рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства супрацоўнікаў ДПС» і праводзіцца адзін раз на два гады.

— Мы праводзім яго, як і беларусы — спачатку ў рэгіёнах, затым на федэральным узроўні. Канкурэнцыя сярод нашых камандаў даволі моцная...






— Выніковае месца каманды вызначалася як сярэдняе арыфметычнае колькасці балаў, набраных у дысцыпліне кожным членам каманды.

Перамогу такім чынам святкавала каманда УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, апярэдзіўшы леташніх чэмпіёнаў — спецпадраздзяленне ДПС МУС «Страла», якія сёлета толькі другія. Замкнула тройку прызёраў каманда УДАІ УУС з Гомельскай вобласці.

**Ілья ЛАПАТО, фота аўтара.**
*Полацк — Мінск.*

## ТРАМВАЙ ХАДЗІЦЬ НЕ БУДЗЕ

**У Мінску з 6 па 19 ліпеня закрываецца трамвайны рух ад вуліцы Чырвонай да д/с «Возера». Гэта неабходна для працягу работ па рэканструкцыі трамвайнага пуці на ўчастку праспекта Машэрава ад вуліцы Куйбышава да вуліцы Старажоўскай.**

Як паведамілі ў КУП «Мінсктранс», на названы перыяд арганізоўваецца часовы аўтобусны маршрут № 142 «Д/с «Возера» — вул. Платонава». Работа трамваяў маршруту № 5 не плануецца, а рух трамваяў па маршруце № 3 з боку д/с «Серабранка» арганізоўваецца да плошчы Змітрака Бядулі.

Паводле інфармацыі КУП «Мінсктранс», 6 ліпеня аднаўляецца трамвайны рух да д/с «Карбышава».

**Магда КРЭПАК**, *«Мінск—Навіны».*

## НОВЫЯ ЦЭНЫ НА КАШТОЎНЫЯ МЕТАЛЫ

**Пастановай Міністэрства фінансаў з 1 ліпеня зацверджаны новыя цэны на каштоўныя металы ў вырабах і ломе, што скупліваюцца ў фізічных асобаў (акрамя куплі-продажу банкаўскімі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі каштоўных металаў у выглядзе мерных зліткаў і манет у фізічных асобаў), і пастаўляюцца ў Дзяржфонд. Апошні раз яны змяняліся з 1 сакавіка.**

Цяпер скупачныя цэны ў рублях па пробах за грам металу наступныя. Золата ў вырабах і ломе: 375-й пробы — 26 610 рублёў, 500-й пробы — 35 480 рублёў, 583-й і 585-й пробы — 41 510 рублёў, 750-й — 53 210 рублёў, 900-й — 63 860 рублёў, 916-й — 64 990 рублёў, 950-й — 67 400 рублёў, 958-й пробы — 67 970 рублёў. Плаціна ў вырабах і ломе 950-й пробы — 87 440 рублёў за грам. Серабро ў вырабах і ломе: 750-й пробы — 840 рублёў, 800-й пробы — 890 рублёў, 875-й — 980 рублёў, 916-й — 1 020 рублёў, 925-й — 1 030 рублёў, 960-й пробы — 1 070 рублёў за грам металу.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

Прэм'ера

# БЕССМЯРОТНЫЯ

## Каханне на вайне перамагае смерць

**Менавіта гэтую думку захацела данесці рэжысёр Валянціна Еранькова. Для сваёй пастаноўкі ў Нацыянальным драматычным акадэмічным тэатры імя Горкага яна абрала аповесць Віктара Астаф'ева. Прэм'ера спектакля «Я твая нявеста» адбылася напярэдадні свята вызвалення Беларусі.**

Месца дзеяння ў спектаклі — ваенны шпіталь, які размясціўся на тэрыторыі, з якой толькі адступілі немцы. Шпіталь нервова-паталагічны, туды паступалі вельмі цяжкія хворыя, параненыя, з кантузіямі, страчанай памяццю. Усе з поля бою, салдаты не памятаюць, хто яны, адкуль, іх у шпіталі ўсе называюць Іванамі. У гэтым шпіталі з'яўляецца Смерць. І на працягу ўсяго кароткага часу яна разам з імі. Кагосьці знаходзіць яшчэ з мірных часоў — збег, схаваўся, падмануў яе. Пазнае тых, каго згубіла па дарозе. Яна кажа: лічу, лічу, нават з ліку збілася...

«Мы хацелі расказаць гісторыю пра каханне на вайне, якое перамагае смерць, таму што яно мацнейшае за вайну, нянавісць, — тлумачыць Валянціна Еранькова. — Пакуль людзі кахаюць, яны бессмяротныя. Філасофія самога Астаф'ева, яго мова, гучанне — да такой ступені дакладнае, што схлусіць у гэтым матэрыяле немагчыма».

Гэта разумелі артысты, якіх на сцэне шмат — 26 чалавек занятыя ў спектаклі, які раней быў пастаўлены ў Магілёўскім тэатры. Таму рэжысёру дазволілі перанесці пастаноўку ў Рускі тэатр. Артысты паставіліся да працы адказна.

— Калі мне далі гэтую ролю, то Валянціна Рыгораўна сказала: прачытай аповесць Астаф'ева «Зарапад», — кажа малады артыст Андрэй Сенькін, выканаўца галоўнай ролі Мішы Ярафеева. — Я прачытаў — і ўвесь цяжар, які я адчуў у сваім персанажы, вісеў на мне ўвесь час, пакуль у нас не пачаліся рэпетыцыі і мы не сталі разбірацца ў сутнасці. Бо я ўсё ж успрыняў аповесць па-свойму. Я зразумеў, што гэта вельмі сур'ёзна і адказна — іграць такіх людзей, якія былі, жылі, сапраўды вельмі пакутавалі. Вобраз Ярафеева — гэта сукупнасць усяго самага станоўчага, моцнага, цудоўнага, гэта сапраўдны хлопец, які любіць жыццё, кахае жанчыну і любіць радзіму. Ён імкнецца быць шчаслівым. Тут шмат фарбаў. Ён паказаны ў розных сітуацыях. І як чалавек, які змагаецца са смерцю, з хваробай. Гэта вельмі трагічна і складана перадаць усе яго адчуванні. Мы жывём цяпер у мірны час і, каб зразумець тых простых герояў, дастаткова датыкнуцца, паглядзеўшы фільм (бо шмат добрых фільмаў пра вайну), паслухаць расказы тых жа ветэранаў. У мяне дзядуля ветэран. Ён мне шмат расказваў пра вайну, як яго параніла... Мне здаецца, спектакль цікавы тым, што ў ім паказаны жывыя людзі, такія, як мы. Толькі з паламаным лёсам. Гэта і кранае, і разрывае сэрца.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**


# ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже объекта государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества с установлением начальной цены продажи неиспользуемого государственного имущества, равной одной базовой величине, определенной законодательством

| Наименование предмета аукциона | Комплекс зданий участковой ветеринарной лечебницы и право заключения договора аренды земельного участка | Здание коровника и право заключения договора аренды земельного участка | Здание командного пункта № 37 и право заключения договора аренды земельного участка | Здание укрытия № 45 и право заключения договора аренды земельного участка | Здание укрытия № 44 и право заключения договора аренды земельного участка | Здание хранилища № 20 и право заключения договора аренды земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Местонахождение недвижимого имущества | Брестская область, Кобринский район, д. Дивин, ул. Больничная, д.15 | Брестская область, Брестский р-н, 1,0 км северо-восточнее д. Тельмы-1 | Брестская область, Брестский район, район п. Сосновка | | | |
| Продавец недвижимого имущества | УЗ «Кобринская района ветеринарная больница» тел.(01642) 2 17 18 | КУСП «Совхоз Брестский» тел. 94 14 83, 94 12 62 | КУМПП ЖКХ «Брестское ЖКХ», тел. (0162) 23 81 15 | | | |
| Сведения о предмете аукциона | В состав комплекса зданий участковой ветеринарной лечебницы 1968 г.п. входит: здание кухни с пристройкой (1 эт., кирпичное, инв. № 123/С-23326, общая площадь 57,5 кв.м), здание склада газобаллонов (1 эт., кирпичное, общая площадь 6,4 кв.м, инв. № 123/С-23323), здание склада дезосредств (1 эт., кирпичное, общая площадь 24,7 кв.м, инв. № 123/С-23320), здание продсклада (1 эт., кирпичное, общая площадь 22,2 кв.м, инв. № 123/С-23322), здание морга (1 эт., общая площадь 7,5 кв.м, инв. № 123/С-23321), здание склада мягкого инвентаря (1 эт., кирпичное, общая площадь 22,1 кв.м, инв. № 123/С-23325). **Земельный участок площадью** 0,4346 га, **срок аренды** – 50 лет. | Здание коровника (инв. № 100/С-25980, 1-эт., общая площадь – 964,3 кв.м, фундамент – бетонный, стены – жел/бет.панели, кирпичные). **Земельный участок площадью** 0,1151 га, установлены ограничения в использовании земельного участка в связи с его расположением в охранной зоне линии электропередачи напряжением 1000 вольт на площади 0,0015 га, срок аренды – 50 лет, использовать для промышленного (сельскохозяйственного) производства, услуг. | Здание командного пункта № 37 (инв. № 100/С-53313), 1968 г.п. общая площадь – 126,0 кв.м, фундамент бетонный, стены и перегородки – ж/бетон, кровля – земляная насыпь. **Земельный участок площадью** 0,0848 га, использовать земельный участок: для строительства объектов промышленного производства, общественного питания, торговли и услуг, **срок аренды** – 50 лет. | Здание укрытия № 45 (инв.№100/С-53312), 1980 г.п., общая площадь – 161,6 кв.м, фундамент бетонный, стены и перегородки – ж/бетон, кровля – обсыпан землей, имеется электроснабжение. **Земельный участок площадью** 0,2630 га, использовать земельный участок: для размещения промышленного производства, общественного питания, торговли и услуг, **срок аренды** – 50 лет. | Здание укрытия № 44 (инв.№100/С-53303), 1980 г.п., общая площадь – 127,2 кв.м, фундамент бетонный, стены и перегородки – ж/бетон, кровля – земляная насыпь. **Земельный участок площадью** 0,0594 га, использовать земельный участок для размещения промышленного производства, общественного питания, торговли и услуг, **срок аренды** – 50 лет. | Здание хранилища № 20 (инв.№100/С-53315), 1970 г.п., общая площадь – 271,0 кв.м, фундамент бетонный, стены и перегородки – ж/бетон, кровля – обсыпан землей, имеется электроснабжение. **Земельный участок площадью** 0,2877 га, использовать земельный участок для строительства объектов промышленного производства, общественного питания, торговли и услуг, **срок аренды** – 50 лет. |
| Условия аукциона | 1. Осуществление предпринимательской деятельности не позднее 6 месяцев со дня подписания акта приема-передачи в течение 5 лет. 2. Создание не менее 3 рабочих мест в течение 1 года со дня подписания акта приема-передачи объекта. 3. Запрещение продажи, иного отчуждения объекта до выполнения покупателем условий договора купли-продажи. | 1. Осуществление покупателем предпринимательской деятельности на объекте не позднее двух лет, со дня подписания акта приема-передачи, в течение пяти лет. 2. Создание до декабря 2011 года не менее трех рабочих мест. 3. Запрещение продажи, иного отчуждения объекта до выполнения покупателем условий договора купли-продажи (декабрь 2016 г.). | 1. Осуществление покупателем предпринимательской деятельности на объекте не позднее одного года, со дня подписания акта приема-передачи, в течение пяти лет. 2. Создание до декабря 2010 года не менее трех рабочих мест. 3. Запрещение продажи, иного отчуждения объекта до выполнения покупателем условий договора купли-продажи (декабрь 2015 г.). | | | |
| Примечание | - | - | Согласно письма БГЗГиЭ использование объектов недвижимости под объекты, которые могут размещаться в санитарно-защитных зонах, расположенных рядом существующих предприятий | | | |
| Начальная цена единого предмета аукциона, руб. | 568 765* | 1 957 300* | 998 040* | 439 370* | 709 580* | 477 340* |
| Сумма задатка, руб. | 56 870 | 195 700 | 99 800 | 43 930 | 70 950 | 47 730 |
| Организатор аукциона | Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, д. 11 тел. (0162) 21 19 82, 23 44 06, 23 12 63, 20 87 85 www.brest-region.by, e-mail: fond@brest-region.by | | | | | |

* определена как сумма начальной цены продажи неиспользуемого имущества, равной одной базовой величине, определенной законодательством, и начальной цены права заключения договора аренды земельного участка. В случае изменения на дату проведения аукциона размера базовой величины, определенной законодательством, на дату проведения аукциона, начальная цена единого предмета аукциона корректируется с учетом изменения размера базовой величины.

Аукцион состоится **7 августа 2009 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

**Для участия в аукционе представляются:**

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с фондом «Брестоблимущество».

2. **К участию в аукционных торгах допускаются негосударственные юридические лица, индивидуальные предприниматели,** представившие следующие документы:

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538;

негосударственным юридическим лицом Республики Беларусь, индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

при подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Не допускается одновременное участие в торгах по одному и тому же предмету аукциона следующих лиц: близких родственников (родителей, детей, усыновителей, усыновленных (удочеренных), родных братьев и сестер, деда, бабки, внуков), а также супругов и их близких родственников; юридических лиц, в уставном фонде которых одно и то же юридическое или физическое лицо имеет долю в размере двадцати и более процентов; юридических лиц, одно из которых в соответствии с законодательством признается дочерним или зависимым по отношению к другому.

**Участник, ставший победителем аукциона, после проведения аукциона обязан:** подписать протокол о результатах аукциона в день аукциона; в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка: внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить расходы по формированию, изменению и прекращением существования земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрации в отношении земельного участка; возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, после чего не позднее 2 рабочих дней заключить с продавцом недвижимого имущества договор купли-продажи, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с «Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462.

**Заявления на участие в аукционе с необходимым пакетом документов принимаются по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 404, 405, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30 по рабочим дням по 6 августа 2009 года включительно.**



## Управляющий по делу о банкротстве (дело № 151-8б/2008 г.)

**реализует с открытых аукционных торгов недвижимое имущество должника, принадлежащее РТП УДП «Ганцевичи ресурсы» УП «Брестоблресурсы».**

В имущественный комплекс входит часть одноэтажного кирпичного здания с двумя пристройками (гараж и склад), с ограждением бетонными плитами и асфальтовым покрытием территории. Условный земельный участок 2390 $м^2$. Общая стоимость имущественного комплекса 42 181 000 рублей без учета НДС.

Аукцион состоится 10 августа 2009 г. в г. Ганцевичи в 12.00 в здании ИМНС Ганцевичского района. Шаг аукциона 5 %. Сумма задатка 10 % от общей стоимости реализуемого имущества.

Заявки на участие в аукционе принимаются

**до 8 августа 2009 г. по адресу: г. Пинск, ул. Парковая, д. 148, кв. 14, тел.: 8 (0165) 32 03 11, моб. тел. 8 (029) 119 27 26.**

УНП 200121292


**Калектыў газеты «Звязда» глыбока смуткуе і выказвае шчырыя спачуванні супрацоўніцы рэдакцыі Вячэрскай Надзеі Іванаўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БРАТА.**

**Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні былому супрацоўніку Мікалаю Міхальчыку з нагоды напаткаўшага яго цяжкага гора — трагічнай смерці ДАЧКІ.**


**Утерянный филиалом Белгосстраха по г. Минску бланк квитанции** о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) **формы 1-СУ, серии ГС № 8512465 считать недействительным**.

# КРЫЗІС КАРЭКТЫВЫ ЎНЁС, АЛЕ З КАЛЯІНЫ НЕ ВЫБІЎ

## Дзяржаўная доследная лесагаспадарчая ўстанова «Вілейскі доследны лясгас» паспяхова спраўляецца з асноўнымі прагнознымі паказчыкамі і сацыяльнымі праграмамі





Лясгасаўская вытворчая сядзіба, над якой дамінуе прыгожы, сучасны адміністрацыйны будынак арганізацыі, адметная ў Вілейцы. Калі сюды ўваходзіш, яшчэ на парозе гэтага галоўнага штаба лесаводаў раёна адчуваецца клапатлівая, гаспадарлівая рука, якая ўмее ствараць прыгажосць. Між іншым, адміністрацыйныя будынкі і 9 лясніцтваў з 11, як адразу ж папярэдзіў дырэктар лясгаса Павел Касяк, таксама падаюць узор сучаснага ландшафтнаафармляльніцкага густу, сталі ўтульнымі куточкамі прыроды ў сваіх вёсках. Неўзабаве і два астатнія лясніцтвы памяняюць свой выгляд.

Чаму мы пачалі размову з боку быццам бы знешняга, з «апратак», з апартаментаў ахоўнікаў лесу? Таму што памятаем здаўна вядомае і заўжды актуальнае: па «адзежынцы» з лясгасам як з партнёрам заказчыкі фарміруюць першае ўражанне, па розуме — развітваюцца. І як цудоўна, што ў Вілейскім лясгасе і «адзежынка», і рэальнае напаўненне яе прадуктыўнымі задумамі, ідэямі, іх увасабленне — узаемазвязаныя.

Вілейчане аб'ектыўна не могуць прэтэндаваць на першынства ў Мінскай вобласці па замацаванай плошчы лесакарыстання, запасах драўніны. Аднак па аб'ёмах лесанарыхтоўкі, рэалізацыі тавараў і паслуг, грашовай выручцы трывала ўваходзяць у тройку лідараў. Вось і за 5 месяцаў г.г. лясгасам зароблена 3 млрд 600 млн рублёў — г.зн. забяспечаны ўзровень адпаведнага мінулагодняга паказчыка. Хоць, прынамсі, некаторыя песімісты прадказвалі рэзкае пагаршэнне вынікаў.

— Адзінае, што не ўдалося ўтрымаць у межах ранейшых параметраў, — гэта экспарт, — тлумачыць Павел Паўлавіч. — Прычыны таму вядомыя, яны ад нас, па сутнасці, не залежаць. Тым не менш пэўныя дадатковыя захады зроблены і ў гэтым напрамку. Заключана некалькі прамых кантрактаў на пастаўку піламатэрыялаў з фірмамі Латвіі, Польшчы. Адгрузілі нават дзве машыны габляваных і палубных дошак у Англію і Ірландыю, як кажуць, на спробу і ацэнку якасці, чакаем выніку.

Для экспартных паставак створана належная перадумова. Тры гады таму лясгас атрымаў міжнародны сертыфікат па сістэме FSC у складзе групы Мінскага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання. Ён прадугледжвае, што пастаўкі тавару за мяжу ажыццяўляюцца пераважна з сертыфікаваных гаспадарак. А іх, між іншым, у рэспубліцы толькі 20. Летась у ходзе міжнароднага аўдзіту вілейчане зноў пацвердзілі гэтае права, бо захоўваюць усе стандарты, якіх патрабуе Лясны Папячыцельскі Савет (FSC) — вельмі ўплывовая арганізацыя.

Увогуле, любы заказ тут імкнуцца выканаць пры любых абставінах і якасна. Што ў сваю чаргу стымулюе асваенне новых відаў прадукцыі. З гэтага года пачалі выпускаць так званы блок-хаус — дошку, у якой адзін бок гладкі, а другі пукаты, імітуе палена-кругляк, выкарыстоўваецца для абшыўкі пабудоў.

— Скарачэнне ж экспарту выклікана найперш цэнавым фактарам, — дапаўняе кіраўніка начальнік планавага аддзела Інга Батура. — Калі летась у структуры экспарту львіную долю складалі балансы, якія ішлі на Польшчу і якіх адпраўлена 22 тысячы кубічных метраў, то па сёлетніх цэнах, каб атрымаць такую ж выручку, а гэта 1 млн 200 тысяч долараў, спатрэбілася б нарыхтаваць 50 тысяч кубаметраў балансаў. Што ўвідавочкі нерэальна.

Кампенсаваць адсутную частку экспартнай выручкі ў лясгасе навучыліся на ўнутраным рынку. Апошняму ўсплёску рэалізацыі піламатэрыялаў паспрыяў удзел у спецыялізаванай выставе, дзе патэнцыйныя пакупнікі самі пераканаліся ў якасных перавагах вілейскіх вырабаў. У выніку запасы прадукцыі ў лясгасе за кароткі тэрмін скараціліся ў 2,5 раза. Пры гэтым змяніўся і склад заказчыкаў. Абсалютная перавага цяпер за прыватным бізнэсам, індывідуальнымі забудоўшчыкамі. І толькі некаторую частку вырабаў раскупляюць будаўнічыя арганізацыі, што выконваюць падрадныя работы ў раёне, яшчэ менш — прадпрыемствы гандлю.





Важная і наступная акалічнасць. Нягледзячы на пэўныя перакосы, выкліканыя сусветным фінансавым крызісам, лясгас вырашыў не прыбягаць да такой меры сваёй стабілізацыі, як павышэнне цэнаў на прадукцыю. Наадварот, калі заказчык «з размахам», закупляе не 2-3 кубы, а дзясяткі ці нават сотню, пастаўшчык гатовы пайсці на зніжэнне цаны. У такім выпадку выгада двухбаковая.

Жывы, энергічны струмень у вытворчы працэс лясгаса ўнесла будаўніцтва пляцоўкі па вытворчасці паліўных трэсак. Яны пераважна выкарыстоўваюцца Вілейскай міні-ТЭЦ, якая працуе на адходах драўніны, а таксама ТЭЦ у пасёлку Бараўляны Мінскага раёна.

— Сёлета мы вырабілі 19 тысяч шчыльных кубаметраў трэсак, адгрузілі спажыўцам 18,5 тысячы, — заўважае старшы майстар участка вытворчасці гэтай прадукцыі Аляксандр Лілін. — Цяпер на тэрыторыі цэха знаходзіцца каля 500 кубаметраў дроў і 2,5 тысячы шчыльных кубоў трэсак. Да пачатку ацяпляльнага сезона будзе створаны запас дроў у межах 3-4 тысяч кубоў, а трэсак — каля 6 тысяч.

Апошнім часам цэх пачаў асобна вырабляць альховыя трэскі, якія ахвотна закупляюць мяса-каўбасныя цэхі, прыватнікі для вэнджання сваёй прадукцыі, а таксама для дэкаратыўных мэтаў. У прыватнасці, іх выкарыстоўваюць для падсыпкі дарожак, сцежак на дачных участках, пры добраўпарадкаванні іншых тэрыторый, у стварэнні садова-паркавых элементаў.

Цікавасць уяўляе яшчэ адна, быццам бы традыцыйная, і ў той жа час у нечым незвычайная вытворчасць. Пасля таго, як у 1997 годзе Вілейскі лясгас узначаліў Павел Касяк, ім было прынята рашэнне аб будаўніцтве новага будынка перапрацоўкі драўніны. З уводам яго магчымасці ў вытворчасці піламатэрыялаў значна пашырыліся. Сёння ВМУ «Рэчкі», якім кіруе Яўген Ганчароў, мае сталярны ўчастак, участак ацыліндроўкі бярвенняў, распілоўкі драўніны, павеці для прасушкі і захоўвання прадукцыі. Вытворчасць аснашчана імпартным, высокапрадукцыйным абсталяваннем.

— Цяпер мы займаемся распілоўкай круглай драўніны і ацыліндроўкай, усё, што выходзіць са станкоў, выстаўляем на продаж як на ўнутраны рынак, так і на экспарт, — тлумачыць Яўген Ганчароў. — У апошні час прадавалі прадукцыю ў Літву, Галандыю, былі нават заказы з Францыі.

Да месца заўважыць таксама, што Вілейскі раён карыстаецца на Міншчыне рэпутацыяй прывабнага дачнага месца. Многія жыхары сталіцы купляюць тут старыя сялянскія хаты, адбудоўваюць іх пад лецішча, другое жыллё. Пілаасартымент лясгаса шырока запатрабаваны таксама і для гэтых мэтаў.

Асаблівую папулярнасць у заказчыкаў набываюць ацыліндраваныя матэрыялы розных дыяметраў. З іх на ўчастку вырабляюць альтанкі, летнікі, лазні, дамкі для паляўнічых. Тут здольныя вытачыць і тоўстыя круглыя бярвенні для дыхтоўнага дома. Дарэчы, вырабы вытворча-механічнага ўчастка «Рэчкі» можна пабачыць на вядомых у рэспубліцы гісторыка-культурным і спартыўных комплексах «Лінія Сталіна», Сілічы, Раўбічы, у Батанічным садзе Нацыянальнай акадэміі навук. За год цэх перапрацоўвае 10-11 тысяч кубаметраў драўніны. Але з улікам попыту на яго асартымент відавочна, што гэта не мяжа. Патрабуецца пашырэнне, а пад яго — новыя магутнасці, дадатковае абсталяванне. Над гэтым і думаюць цяпер дырэктар і яго кіраўніцкі штаб.

На тэрыторыі ўчастка літаральна нядаўна зманціравана сучасная італьянская сушылка піламатэрыялаў, якая адкрые новыя перспектывы ў забеспячэнні якасных параметраў вырабаў. Засталося даўкамплектаваць яе агрэгатам-цеплаўтваральнікам. Думаецца, вырашэнне гэтай задачы — таксама пытанне найбліжэйшых месяцаў.

У Вілейскім лясгасе шмат прыгожых мясцінаў, запаведных куточкаў. З такой высокай ацэнкай можна смела падыходзіць і да пітомніка, дзе культывуецца і разводзіцца звыш 40 парод дрэў і кустоў. Цяжка было паверыць у тое, што мы пачулі — з пітомніка штогод бярэцца на пасадку каля 4 мільёнаў саджанцаў і сеянцаў. Але факт застаецца фактам. Ужо два гады пітомнік з'яўляецца пітомнікам высокай культуры. На 30 гектарах, якія ён займае, вырошчваюцца саджанцы сасны, елкі для высадкі на плошчах лесаўзнаўлення. Пабудаваны дзве цяпліцы, у якіх прыменены сучасныя тэхналогіі развядзення раслін, у прыватнасці метад чаранкавання, што дазваляе атрымліваць пасадачны матэрыял з наследнымі мацярынскімі якасцямі.

Акрамя клопату аб лясных «абарыгенах», робяцца высадкі і вырошчваюцца дэкаратыўныя расліны для азелянення гарадоў і населеных пунктаў. Найбольш цікавыя экзоты лясгас набывае ў Батанічным садзе НАН Рэспублікі Беларусь, каб потым атрымаць меркаваныя дрэвы ці кусты. Летась пітомнік рэалізаваў усялякай «расады» на 50 млн рублёў. Прадаваў таксама ягады чарнаплоднай рабіны, плады шыпшыны.














— У сёлетніх, больш складаных, чым раней умовах, мы ставім задачу, каб кожнае структурнае падраздзяленне працавала выніскова, каб захаваць калектыў, які налічвае цяпер каля 500 чалавек, — разважае Павел Касяк. — Прычым, калі не лічыць сезонных рабочых, ён у нас стабільны. Зарплата таксама вышэйшая, чым у многіх іншых лясгасах вобласці і прадпрыемствах Вілейкі.

Не без уліку гэтых абставін уладкавацца на працу ў лясгас жадалі б многія. Аднак спецыфіка арганізацыі перадумоўлівае, што леснікі, іншыя спецыялісты патрэбны не толькі ў горадзе, а часцей у іншых месцах раёна, у лясніцтвах. З мясцовых прэтэндэнтаў іх і трэба набіраць. Між тым лясгас і за свой кошт рыхтуе кадры патрэбнага профілю ў Беларускім тэхналагічным універсітэце і Полацкім каледжы, а таксама ў Бранскай акадэміі (Расія). Сёлета ў калектыў улілося пяць маладых спецыялістаў. Некаторыя з іх самі выбралі Вілейскі доследны лясгас у якасці свайго першага (а магчыма, і апошняга) месца працы. А гэта сведчанне высокага іміджу арганізацыі ў карпаратыўным асяроддзі.

Пры ўсіх складанасцях не пакінута без увагі адміністрацыі і жыллёвае пытанне. У канцы мінулага года створаны жыллёвы кааператыў «Леснічоўка», які аб'яднаў 15 забудоўшчыкаў з ліку членаў калектыву, але дольшчыкам у ім з'яўляецца і сам лясгас. Кааператыў зарэгістраваны ў аблвыканкаме. Дом будзе ўзводзіцца на фундаменце, які некалі на свае сродкі заклаў лясгас, калі меўся будаваць сабе адміністрацыйны будынак. Аднак пасля перадачы яму вытворчай базы былога грузавога аўтапарка патрэба ў гэтым адпала. І вось цяпер нявыкарыстанаму нулявому цыклу канторы са згоды міністра знайшлося прымяненне, што значна паменшыць выдаткі забудоўшчыкаў. Бо на падрыхтоўку фундаментаў было затрачана 120 млн рублёў.

— Стымулам для працоўнай актыўнасці людзей у нас выступае і спаборніцтва сярод лясніцтваў, майстарскіх участкаў, леснікоў, вадзіцеляў, трактарыстаў і іншых катэгорый, — лічыць намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце Таццяна Анішчык. — Пераможцы адзначаюцца маральна і матэрыяльна. Гэтак жа адказна ставімся мы да забеспячэння бяспечных умоў працы, да стварэння належных бытавых умоў на аб'ектах. У распараджэнні маем спартыўную залу, дзе праводзяцца розныя ўнутрыкалектыўныя, гарадскія і нават абласныя спаборніцтвы.

Па выніках апошніх трох гадоў у спабоніцтве сярод лясніцтваў першынство трымае Вілейскае, якім кіруе Мікалай Скулавец. Па якіх крытэрыях вылучаюць тут у пераможцы? Па-першае, улічваецца стан аховы лесу, правядзенне высечак догляду, арганізацыя лесааднаўлення. Па другое, па выкананні прамысловых заданняў — нарыхтоўцы і вывазцы драўніны, яе рэалізацыі. Пад увагу бярэцца таксама яшчэ цэлы шлейф паказчыкаў.

Сёлета, у Год роднай зямлі, у лясніцтве значную ўвагу надалі пасадцы лесу, далучылі да гэтай высакароднай справы грамадскасць. Прынамсі, увялі ў лесакарыстанне новую культуру — лістоўніцу еўрапейскую, якую пасадзілі на плошчы 1,2 гектара. Эксперыментавалі таксама ў прымяненні сеялкі дакладнага высеву насення сасны на плошчы 0,9 гектара.

Аповед пра Вілейскі доследны лясгас быў бы няпоўным, калі б мы не заўважылі такую акалічнсць: яго кіраўніцтва і ўвесь калектыў тут сапраўды пастаянна жывуць творчым пошукам, даследніцтвам, эксперыментатарствам. Па сведчанні той жа Таццяны Анішчык, якая аднача́сова з'яўляецца і старшынёй прафкома, на базе іх гаспадаркі праходзіць нямала семінараў па абмене досведам. Былі тут калегі з рэгіёнаў Расійскай Федэрацыі, з практыкай перапрацоўкі драўніны ў трэскі знаёміліся прадстаўнікі Ляснога агенцтва Швецыі. А спецыялісты з лясгасаў сталічнай вобласці нагогул чэрпаюць тут нямала ідэй для рэалізацыі ў сябе з мэтай павышэння эфектыўнасці вытворча-гаспадарчай дзейнасці. І вілейчане з адкрытым сэрцам заўжды гатовы дзяліцца сваімі набыткамі.

**Мікалай КАЧАТКОЎ,**
**Віктар ПАЗНЯКОЎ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

Дзяржаўная доследная лесагаспадарчая ўстанова
«Вілейскі доследны лясгас»

**ПРАДУКЦЫЯ:**

**— піламатэрыялы абразныя (неабразныя);**
**— бярвенні ацыліндраваныя;**
**— абшыўка сушаная (18мм,32мм);**
**— абшыўка не сушаная (18мм,32мм);**
**— дошка падлогі сушаная (35-40мм);**
**— дошка падлогі не сушаная (35-40мм);**
**— лесаматэрыялы круглыя і дровы хваёвых, ліставых парод.**

*Ёсць магчымасць дастаўкі прадукцыі на любую адлегласць па Мінскай вобласці.*

**222410, Мінская вобл.,**
**г. Вілейка, вул. Стаханаўская, 221**

**Кантактныя тэлефоны:**
8 (01771) 3 22 50 — прыёмная;
3 22 49 — вытворчы аддзел;
3 27 65 — эканамічны аддзел.
**Цэх дрэваапрацоўкі ВМУ «Рэчкі» — 8 (01771) 6 11 36**
**E-mail:vlk-forestry@mail.ru**
**leshozvileyka@tut.by**

*УНП 600010664*







**На здымках:**

**1.** Дырэктар Вілейскага доследнага лясгаса Павел Паўлавіч КАСЯК.

**2.** Лясныя абшары, упрыгожаныя блакітнымі карункамі рэк і азёр — такой паўстае тэрыторыя Вілейскага доследнага лясгаса. Але за гэтай спадчыннай прыгажосцю нельга не бачыць штодзённую, адказную і няпростую працу ўсіх работнікаў названага прадпрыемства. Гэтыя фотаздымкі знаёмяць з машыністам пагрузчыка Алегам СУБАЧАМ і галоўным механікам лясгаса Аляксандрам КВЯТКЕВІЧАМ.

**3.** Лес шчодра адорвае чалавека ўзамен на штодзённы клопат пра памнажэнне зялёнага багацця. На гэтых фотаздымках добра відаць, як пад шклом цяпліцы падымаюцца парасткі заўтрашніх лясоў (пра іх клапоціцца начальнік пітомніка Марына ШАТРАЎКА) і як паступае на перапрацоўку ўраджай з лясных плантацый (на гэтым участку працуе Андрэй ВАРАНЬКО). Тут жа мы знаёмім чытачоў з рабочымі ўчастка «Рэчкі» Андрэем ЧАЎЛЫТКАМ, Сяргеем ШУПЕНЬКАМ, Генадзем ШАБЛЫКАМ , Міхаілам МІЦКЕВІЧАМ.

**4.** Інжынер па ахове працы, чэмпіён свету 2009 года па валцы лесу Вадзім ВАНСОВІЧ і ляснічы Іжскага лясніцтва Мікалай СЕЧКА.

**5.** Начальнік участка «Рэчкі» Яўген ГАНЧАРОЎ.

**6.** Такія дамкі лёгка пабудаваць з камплекта лесаматэрыялаў, якія вырабляюць у лясгасе.

**7.** Трэскі — гэта не толькі паліва. Старшы майстар Аляксандр ЛІЛІН паказаў нам трэскі вольхі, незамянімую пры вэнджанні мясных вырабаў па старажытных рэцэптах.

**8.** Ляснічы Вілейскага лясніцтва Мікалай СКУЛАВЕЦ у музеі прыроды, які стварылі мясцовыя працаўнікі.

**9.** Лес — месца працы і месца адпачынку пасля працоўнага дня, — лічыць рабочы лясгаса Анатоль МІСЮЛЬ і сцвярджае, што грыбы, ягады, арэхі і рыба на Вілейшчыне — самыя смачныя!

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 14 (614)
аддзел рэкламы ☎ 287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

# ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

***ПРАДАЕЦЦА:***

❒ Дом 11x7 м. Можна на знос. Вёска Галынь, Навагрудскі раён. Тэл.: (01597) 71 497, 8 029 253 35 69.

❒ Дом у Рудзенску (Асіповіцкі напрамак) з усімі выгодамі. Ёсць гараж, майстэрня, сад, 11 сотак зямлі. Магчымы абмен на Мінск. Тэл. 8 029 668 58 40.

❒ Дом з усімі выгодамі 15 км ад Баранавічаў, плошчай 100 м$^2$ або абмяняю на кватэру ў Мінску. Тэл.: 8 029 820 37 43, 8 0163 73 24 16.

❒ 1-пакаёвая кватэра з усімі выгодамі ў Маладзечне. Тэл.: 8 01773 50 738, 8 029 755 48 96.

❒ Электрычная пліта шклокерамічная «Gefest» (Брэст), новая (50x57 см). Тэл.: 8 017 295 96 84, 8 029 115 56 99.

❒ Касілка навясная КН-1 да трактара МТЗ 05, новая, танна. Тэл. 8 01792 54 453.

❒ Трактар. Ёсць дакументы. Прычэп з дакументамі. Новы пускач да МТЗ. Тэл. 8 029 761 64 79.

❒ «Опель Зафіра» 2000 г.в. 2,0 ТД, 7 месцаў або абмяняю на трактар ці грузавік. Магчымыя варыянты. Тэл. 8 029 761 64 79.

❒ Новы задні мост ЗІЛ у зборы. Тэл.: 8 01597 269 05, 8 029 915 08 13 .

❒ Рухавік МТЗ-80. Таксама бочка ёмістасцю 2 тоны на гумавых колах. Тэл. 8 01713 74 654. Мыслівец Раіса Паўлаўна.

❒ Добрая пародзістая 4-месячная козачка. Тэл. 8 02137 391 54. Шаргаева Зінаіда Сяргееўна.

❒ Хутар у Слуцкім раёне, 25 сотак, сад, калодзеж. Тэл. 8 029 378 48 46.

***КУПЛЮ***

❒ Саджалку двухрадную; КТ-25 кабіну або разабраны; КМТЗ УК кабіну або трактар без дакументаў. Тэл. 8 029 761 64 79.

❒ Кватэру або ўчастак у г. Мінску або Баранавічах непрыватызаваны або з даўгамі. Магчымыя варыянты. Тэл. 8 029 761 64 79.

ЗВЯЗДА

## КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

**Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:**
**220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.**

**АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.**

Пашпарт, серыя______ №___________ Выдадзены ______________________

Подпіс ______________ Дата _________

## Кватэрнае пытанне

# ЗГОДНА З ДАМОВАЙ

***Сёлета падыходзіць наша чарга для атрымання льготнага крэдыту на паляпшэнне жыллёвых умоў, і мы плануем купіць сабе прыватны дом. Пытанне: які кошт яго (рынкавы, прызначаны прадаўцом, той, што пазначаны ў тэхпашпарце, альбо нейкі іншы) павінен улічвацца пры выдзяленні дзяржпадтрымкі?***

**В. К.**, *Брэст*

У адпаведнасці з дзейным парадкам ільготны крэдыт на набыццё жылога памяшкання выдзяляецца ў памеры найменшага кошту гэтага жылога памяшкання, які вызначаецца па дагаворы куплі-продажу або ў адпаведнасці з заключэннем аб яго ацэначным кошце, што выдадзена ў вызначаным парадку.

У адпаведнасці з Указам кіраўніка дзяржавы ад 13 кастрычніка 2006 года № 615 «Аб ацэначнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» з 17 мая 2007 года ўступіла ў сілу Палажэнне аб ацэнцы кошту аб'ектаў грамадзянскіх правоў, якое рэгулюе адносіны, што ўзнікаюць у працэсе дзейнасці па ацэнцы кошту асобных аб'ектаў (у прыватнасці — будынкаў, пабудоў, ізаляваных памяшканняў, не завершаных будаўніцтвам аб'ектаў, і інш.).

Згодна з гэтым Палажэннем ацэнка кошту аб'ектаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дзяржаўнымі стандартамі Рэспублікі Беларусь па ацэнцы кошту аб'ектаў грамадзянскіх правоў, якія з'яўляюцца абавязковымі для прымянення ацэншчыкамі, што маюць вышэйшую эканамічную, юрыдычную або тэхнічную адукацыю і атрымалі спецыяльнае пасведчанне аб атэстацыі.

Дзеянне Указа № 615 і новага Палажэння аб ацэнцы распаўсюджваецца і на адносіны, звязаныя з набыццём грамадзянамі жылых памяшканняў з выкарыстаннем аднаразовых бязвыплатных субсідый і льготных крэдытаў. Таму, згодна са змяненнямі, што ўнесены ў Палажэнні аб выдзяленні субсідый і льготных крэдытаў (зацверджаны пастановамі ўрада адпаведна ад 30 красавіка 2002 года № 555 і ад 24 ліпеня 2002 года № 992), кошт жылога памяшкання, якое набываецца, павінен вызначацца згодна з дагаворам куплі-продажу або заключэннем аб ацэнцы (па вызначэнні ацэначнага кошту) жылых памяшканняў (для жылых памяшканняў у сельскіх населеных пунктах — з улікам гаспадарчых пабудоў), якое выдадзена ў вызначаным заканадаўствам парадку арганізацыяй па дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй.

Канкрэтны памер ільготнага крэдыту на названыя мэты не павінен перавышаць 70 працэнтаў разлічанага ў вызначаным парадку максімальнага памеру крэдыту, што выдзяляецца грамадзянам на будаўніцтва жылля з улікам нарматыву льготна крэдытаванай плошчы жылога памяшкання тыпавых спажывецкіх якасцяў.

**Віктар САВІЦКІ.**


# УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ ОАО «ТЕХНОБАНК»!

Настоящим уведомляем о принятии внеочередным Общим собранием акционеров ОАО «Технобанк», проведенным в очной форме 30 июня 2009 года (Протокол № 3), решения о внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Технобанк», и о Вашем праве требовать выкуп акций, если это явилось следствием ограничения прав акционеров.

Подача акционерами ОАО «Технобанк» заявлений с требованиями о выкупе акций осуществляется в ОАО «Технобанк» в течение 20 рабочих дней с даты проведения Общего собрания акционеров (30.06.09).

